

ПЕРШЫ ПАРТЫЗАНСКІ ГЕРОЙ 11

ШАХМАТНАЯ БЕЛАРУСЬ: ХОД КАНЁМ 12




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

27 ЛІСТАПАДА 2018 г. АЎТОРАК № 228 (28844)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір КУХАРАЎ, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«У прыярытэце ў нас сёння — рухацца па зніжэнні ставак для таго, каб агульныя крэдыты сталі даступнымі, каб чалавек, незалежна ад таго, у якой ступені патрэбнасці ён знаходзіцца, меў магчымасць браць даступныя крэдыты. А мы, як будаўнікі, павінны ў сваю чаргу даць яму даступнае і таннае жыллё. Тады гэтае пытанне будзе вырашацца эвалюцыйным шляхам. Налета трэба павялічыць колькасць кватэр для шматдзетных. У 2018-м для іх будзе пабудавана 7,5 тысячы кватэр, на наступны год ставім задачу пабудаваць больш за 10 тысяч. Акрамя таго, будзем максімальна прапаноўваць шматдзетным будаўніцтва індывідуальнага жылля. Гэта вырашае вельмі шмат пытанняў».*

# Звон памяці



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Шасцігадовая жыхарка пасёлка Калодзішчы Мінскага раёна Варвара АНТОНЧЫК звоніць у звон-помнік, які ўстаноўлены на Брылёўскім полі (пад вёскай Брылі Барысаўскага раёна). На ім у лістападзе 1812 года падчас пераправы цераз раку Бярэзіну загінула шмат людзей — і воінаў, і грамадзянскага насельніцтва, як з боку французскай, так і з боку рускай армій. Дацягнуцца да звона маленькай Варвары дапамагае яе зямляк Сяргей СУШКЕВІЧ.

## КОРАТКА

- **Эстафета «Полымя свету» да ІІ Еўрапейскіх гульняў пройдзе па знакавых мясцінах Беларусі.**
- Помнік народнаму паэту БССР Нілу Гілевічу адкрылі нядаўна на яго магіле на Кальварыйскіх могілках.



- **Беларусь і Казахстан маюць намер разам выпускаць беспілотнікі.**
- Беларускія стужкі, якія сталі прызёрамі і дыпламантамі нацыянальнага конкурсу XXV Мінскага міжнароднага кінафестывалю «Лістапад», з 27 да 29 лістапада пакажуць у эфіры тэлеканала «Беларусь 3» у спецыяльных выпусках праграмы «Час кіно».

Разумныя грошы

# Напісанаму верыць

### Інфармацыя аб прадукце не павінна ўводзіць у зман

**Банкі цяпер не змогуць павялічваць працэнты па крэдытах у аднабаковым парадку, а таксама навязваць кліенту дадатковую паслугу, не даўшы права выбару. Гэта прадугледжана зменамі ў Банкаўскім кодэксе, якія ўжо ўступілі ў сілу.**

Фінансавым структурам таксама забараняецца ў аднабаковым парадку памяншаць стаўку па ўкладзе. Выключэнне — выпадак, калі дагаворам устаноўлена пераменная працэнтная стаўка, вызначаная праз паказчык, змена якога адбываецца незалежна ад рашэння банка (напрыклад, калі стаўка па крэдыце або ўкладзе прывязаная да стаўкі рэфінансавання Нацыянальнага банка).

### Крэдыты падаражэлі, а дэпазіты знізіліся. Пакуль

Што гэта дае кліенту на практыцы? Па-першае, упэўненасць у заўтрашнім дні. У першай дэкадзе лістапада большасць банкаў краіны прыпыніла прыём заявак па дагаворах, дзе крэдыты першапачаткова прапаноўваліся пад меншы працэнт, які без бачнай на тое прычыны павялічваўся банкам самастойна. Напрыклад, цяпер не ўдасца заключыць крэдытны дагавор на куплю нерухомасці на 15 гадоў з першапачатковай стаўкай 13 працэнтаў гадавых, якая потым вырастае да 15 працэнтаў. Цяпер умовы будуць дакладна прапісаныя, а працэнты зафіксаваныя або прывязаныя да стаўкі рэфінансавання.

СТАР. 4

На слыху

# «ЗАПАЛІЛІ» НА ЎСЕ СТО!

**Конкурс, які другі раз прайшоў у нашай краіне, называюць адным з найлепшых за ўвесь час**




Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

**25 лістапада мільёны гледачоў у розных краінах свету сачылі на тэлеэкранах і ў анлайн-трансляцыі ў Сеціве за фіналам міжнароднага дзіцячага конкурсу «Еўрабачанне-2018», які праходзіў у Мінску. Дзеючая сістэма галасавання, пры якой складваюцца ацэнкі нацыянальных журы і балы ад гледачоў, дазволіла трымаць інтрыгу да апошніх імгненняў шоу.**

СТАР. 3

ISSN 1990 - 763X


ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

СЯБРОЎ У НОВЫМ ГОДЗЕ НЕ МЯНЯЮЦЬ!

Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2019 года.

Заставайцеся з намі — будзе цікава!

# КАНТРОЛЬ РУБЛЁМ

## Залог поспеху — гатоўнасць да перамен і здольнасць мяняцца самім

**Такое меркаванне выказаў Аляксандр Лукашэнка падчас даклада ўрада, Нацыянальнага банка, аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама аб ацэнцы вынікаў 2018 года і праектах прагнозных дакументаў сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2019 год.**

### ІЛЮЗІЙ БЫЦЬ НЕ ПАВІННА

Экватар бягучай пяцігодкі пройдзены, падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. З аднаго боку, эканоміка расце практычна па ўсіх галінах, ёсць адносная цэнавая стабільнасць. Павялічваюцца даходы насельніцтва, па меры магчымасцяў падтрымліваюцца пенсіянеры. «Складваецца прафіцыт па знешнім гандлі, што камусьці здавалася немагчымым яшчэ 10 гадоў таму назад», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Аднак пры гэтым ні ў кага не павінна ўзнікаць ілюзіі поспеху, адзначыў Прэзідэнт. «Добрыя паказчыкі дэманструюць многія краіны нашага рэгіёна. А значыць, мы толькі своечасова карыстаемся магчымасцямі чарговай хвалі цыклічнага, кан'юнктурнага росту, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Але, натуральна, такі рост не бясконцы. Шчыра кажучы, вельмі насцярожвае тое, што асноўныя трэнды нашай эканомікі апошнім часам пайшлі ўніз і Беларусь зноў уваходзіць у зону развіцця з тэмпамі, ніжэйшымі за сярэднесусветныя».

На яго думку, адставаць — непрымальна. Без упэўненага і ў добрым сэнсе агрэсіўнага росту Беларусі не вырашыць ні эканамічныя, ні сацыяльныя задачы, і разглядаць прагнозныя дакументы трэба яшчэ шырэй, упэўнены кіраўнік дзяржавы.

«Наш дабрабыт залежыць у тым ліку ад здольнасці эканомікі адказваць на глабальныя выклікі, якіх сёння нямала. У наяўнасці санкцыйны рэжым, геапалітычная нестабільнасць, гандлёвыя войны — гэта ўжо новая «нармальнасць», — канстатаваў беларускі лідар. — Ацэньваючы сумарны доўг усіх дзяржаў, які перавысіў палову сусветнага валавога ўнутранага прадукту, Міжнародны валютны фонд прагназуе верагоднасць новага фінансавага крызісу».

У сувязі з гэтым Прэзідэнт папрасіў прэм'ер-міністра адказаць на наступны пытанні: якія пункты росту ўрад бачыць на 2019 год? На чым будзе пабудавана ўстойлівая і канкурэнтаздольная эканоміка з узроўнем ВУП не менш за 100 мільярдаў долараў?

### ШТО ТРЭБА ВЫРАШЫЦЬ

Дарэчы, міжнародныя эксперты і навукоўцы лічаць, што патэнцыял, перш за ўсё чалавечы, — і гэта галоўнае, — у Беларусі ёсць. Калі ёсць людзі, кадры, здольныя рэалізоўваць пастаўленую задачу, значыць, яе рэальна вырашыць. «Аднак захоўваюцца фактары, якія стрымліваюць, і я не бачу ў прагнозных дакументах дзеянняў для іх ліквідацыі», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. Перш за ўсё гаворка ідзе аб пытаннях незбалансаванасці бягучага рахунку ў плацежным балансе, а таксама аб сур'ёзнай залежнасці экспарту ад аднаго рынку.

На думку кіраўніка дзяржавы, урад спрабуе плаўна абысці і праблему неэфектыўных прадпрыемстваў, якую міністры, ды і губернатары, прывыклі закрываць бюджэтнымі грашамі.

Акрамя таго, практычна спынілася работа па стварэнні лепшых умоў для інвестыцый. «Яна тоне ў агульных развагах і нейкай бюракратыі, а на практыцы нічога сур'ёзнага не прапанавана», — дадаў беларускі лідар.

Прэзідэнт падкрэсліў, што гандлёвыя войны і крызіс СГА на фоне палітычнай нявызначанасці ў свеце пазбаўляюць фінансавых інвестараў цікавасці да рызыкі і могуць справакаваць адток капіталу ў так званыя ціхія гавані. У такой нявызначанасці ўраду асабліва важна мець дакладныя планы і яснае разуменне, як і калі краіна выйдзе са стану пікавых выплат па дзяржаўным доўгу.

«Сёння мы павінны разабрацца, дзе прычыны сістэмнага характару, а дзе гаворка ідзе проста пра адсутнасць дысцыпліны, а можа, і разумення таго, што трэба рабіць і як гэта трэба рабіць, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — Гатоўнасць да арганічных пераўтварэнняў і здольнасць змяняцца самім — залог поспеху і канкурэнтаздольнасці».

### ВЫРАЗНА І КАНКРЭТНА

Беларускі лідар пацікавіўся, як выкананы яго патрабаванні па скарачэнні падтрымкі тым прадпрыемствам, кіраўнікі якіх «так і не навучыліся працаваць, ці не хочуць». Ён запатрабаваў адказаць, ці рэальна яе скарацілі, ці вырашылі даваць даўгі і іх вяртанне нават не ўлічваюць у даходах бюджэту?

«Як павялічана фінансаванне развіцця чалавечага капіталу — здароўя, адукацыі, спорту, культуры? — спытаў Прэзідэнт. — Шмат шуму вакол абнаўлення Падатковага кодэкса. Як мне дакладваюць — сёння ўдакладнім — у вас не атрымалася зрабіць яго зразумелым, без унутраных супярэчнасцяў, а галоўнае — камфортным для людзей і бізнесу. Калі гэта так, то грамадства не трэба бударажыць сырымі і непрапрацаванымі дакументамі. Спакойна трэба дапрацаваць, дашліфаваць дакументы, але строга па тых прынцыпах, як даручана».

Ад старшыні праўлення Нацыянальнага банка Беларусі Паўла Калаура кіраўнік дзяржавы запатрабаваў выкласці выразны даклад аб мерах па стымуляванні эканамічнага росту, якія плануе Нацыянальны банк у 2019 годзе. Прэзідэнт адзначыў, што яго здзіўляе атрыманая ў спадчыну ад папярэдняга складу ўрада беспрынцыповасць у выкананні даручэнняў кіраўніка дзяржавы. Паводле яго слоў, не прайшло і года з моманту заўваг папярэднікам, як па выніках дзевяці месяцаў работы ад новага прэм'ер-міністра Прэзідэнт атрымаў ліст аналагічнага зместу з просьбай зняць з кантролю амаль паўсотні даручэнняў як выкананыя.

Пры гэтым беларускі лідар падкрэсліў: да іх выканання далёка, паколькі кантрольныя органы і ведамствы прадставілі шматлікія заўвагі, больш за 20 старонак. Аляксандр Лукашэнка параіў прэм'ер-міністру Беларусі Сяргею Румасу ўнікаць у дакументы, якія яму прапаноўваюць падпісаць з падачы сваіх падначаленых.

Акрамя таго, кіраўнік дзяржавы падкрэсліў: вельмі важна, каб дакументы, якія разглядаюцца на нарадзе, былі падтрыманы губернатарамі.

### ЯКІЯ ВЫНІКІ?

На нарадзе прэм'ер-міністр Сяргей Румас адзначыў, што ў цэлым эканоміка развіваецца ў рамках зацверджанага на 2018 год прагнозу. Па выніках работы за 10 месяцаў усе сем ключавых паказчыкаў эфектыўнасці дзейнасці ўрада і Нацыянальнага банка выкананы. Забяспечваецца гадавы прагноз інтэгральнага паказчыка развіцця эканомікі — ВУП. У межах прагнозу па валавым рэгіянальным прадукце знаходзяцца тры рэгіёны — Мінск, Віцебская і Гродзенская вобласці, ніжэй прагнозу, але вышэй узроўню мінулага года ідуць астатнія вобласці.

Па выніках года ўрадам прымаюцца меры па захаванні тэмпаў росту ВУП на ўзроўні 103,5 %. Аднак некаторыя вобласці не пацвярджаюць выкананне прагнозу па валавым рэгіянальным прадукце (ВРП).

Прэм'ер падкрэсліў: у цэлым, у чацвёртым квартале мэтавая задача ў 1000 рублёў у краіне будзе забяспечана. У бюджэтнай сферы заробак у кастрычніку павялічыўся да 769 рублёў — гэта 77 % ад сярэдняй зарплаты па краіне. У чацвёртым квартале заработная плата бюджэтнікаў ацэньваецца на ўзроўні 800 рублёў.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

**Каментарыі ў тэму**

## Колькі павінна складаць сярэдняя зарплата ў 2019 годзе?

**Гэтую і іншую інфармацыю па выніках нарады агучыў журналістам прэм'ер-міністр Сяргей РУМАС.**

Сярэдняя заработная плата па годзе ў 2019-м павінна скласці не менш за 1025 рублёў. Зарплата ў бюджэтным сектары павінна быць не меншай за 80 % ад сярэдняй заработнай платы — на ўзроўні 820 рублёў.

Таксама ўрад плануе ў 2019 годзе працягнуць збліжэнне мінімальнай заработнай платы і мінімальнага спажывецкага бюджэту для таго, каб з 1 студзеня 2020 года гэтыя дзве велічыні зраўняліся. «Па сённяшніх нашых ацэнках, мінімальная зарплата з 1 студзеня 2020 года павінна скласці 377 беларускіх рублёў», — заявіў ён.

Паводле слоў **старшыні праўлення Нацыянальнага банка Беларусі Паўла КАЛАУРА,** на наступны год будзе захавана пераемнасць грашова-крэдытнай палітыкі, якая праводзілася ў Беларусі ў папярэднія гады. Інфляцыя прадугледжваецца не больш за 5 %. Будзе захаваны гнуткі рэжым курсаўтварэння, які дазваляе нашым прадпрыемствам і эканоміцы ў цэлым адаптавацца да ўнутраных і знешніх шокаў. Працэнтныя стаўкі па крэдытах працягнуць той трэнд, які быў у бягучым годзе, гэта значыць, яны будуць імкнуцца да аднназначных велічынь.

Як адзначыў у размове з журналістамі **міністр фінансаў Беларусі Максім ЕРМАЛОВІЧ,** у 2019 годзе даходная частка бюджэту істотна не павялічыцца ў намінальным выражэнні ў параўнанні з гэтым годам. Кансалідаваны бюджэт па даходах вырасце на 5 %. Яшчэ ў наступным годзе ўзмоцніцца сацыяльная накіраванасць бюджэту. Дзяржаўная падтрымка ў наступным годзе будзе скарочана ў адносінах да рэальнага сектара эканомікі на 10 %.

Што да Падатковага кодэкса, Максім Ермаловіч расказаў, што вакол яго разгарнулася, напэўна, самая вялікая дыскусія ў рамках нарады: «Даручана ўраду, Савету Рэспублікі сумесна з Палатай прадстаўнікоў, Адміністрацыяй Прэзідэнта яшчэ раз уважліва прааналізаваць нормы, закладзеныя ў праект новай рэдакцыі Падатковага кодэкса. Калі неабходна, у кароткі тэрмін на працягу двух тыдняў Прэзідэнт даручыў унесці неабходныя змяненні ў гэты дакумент з тым, каб яго ўжо разглядаць і прымаць у рамках стандартнай працэдуры законапраектнай дзейнасці».

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Парашэнка прапануе ўвесці ў краіне ваеннае становішча



Прэзідэнт Украіны Пётр Парашэнка ўнёс у Вярхоўную раду пытанне аб увядзенні ў краіне ваеннага становішча. Пра гэта ён заявіў у ходзе пасяджэння Савета нацыянальнай бяспекі і абароны. Пакуль ідзе гаворка пра тое, каб Вярхоўная рада прыняла рашэнне аб увядзенні ва Украіне рэжыму ваеннага становішча на 60 дзён.

Па словах старшыні СНБА Аляксандра Турчынава, ваенны кабінет, скліканы напярэдадні прэзідэнтам, «канстатаваў, што нападзенне расійскіх ваенных на караблі ВМС Украіны з'яўляецца ні чым іншым, як актам ваеннай агрэсіі».

У ноч на панядзелак ФСБ Расіі паведаміла, што расійскія памежнікі ўжылі зброю ў дачыненні да ўкраінскіх ваенных караблёў, якія перасеклі дзяржаўную мяжу.

У сувязі з рэзкім абвастрэннем сітуацыі ў Керчанскім праліве ўчора ўвечары на экстранная пасяджэнне сабраўся Савет Бяспекі ААН. Агенцтва AFP перадае са спасылкай на дыпламатычныя крыніцы, што пасяджэнне было склікана па ініцыятыве двух бакоў — украінскага і расійскага.

### Моцны землятрус у Іране

Колькасць пацярпелых падчас землятрусу ў правінцыі Керманшах на захадзе Ірана павялічылася да 634 чалавек.

Землятрус магнітудай 6,4 адбыўся 25 лістапада каля горада Серэ-Поле-Захаб у раёне ірана-іракскай мяжы, паведамляе іранскі сейсмалагічны цэнтр Інстытута геафізікі Тэгеранскага ўніверсітэта. Эпіцэнтр землятрусу знаходзіўся ў правінцыі Керманшах. Штуршкі адчуваліся таксама ў Багдадзе і Азербайджане.

### Алімпійскі чэмпіён выйшаў на матч п'яны

Канадскі кёрлінгіст Раян Фрай адхілены ад удзелу ў этапе Сусветнага тура ў канадскім Рэд-Дзіры з-за выхаду на матч у стане моцнага алкагольнага ап'янення, перадае ТАСС, спасылаючыся на канадскую карпарацыю СВС.

Разам з алімпійскім чэмпіёнам дыскваліфікавана ўся каманда, ігракі якой таксама знаходзіліся на лёдзе ў нецвярозым стане.

«Яны былі вельмі п'яныя, лаяліся і ламалі шчоткі для гульні — у цэлым, паводзілі сябе непрымальна, — сказаў прадстаўнік аргкамітэта этапу Уэйд Тэрбер. — Яны таксама ўстроілі беспарадак у раздзявальні. Ігракі іншых камандаў скардзіліся, што Фрай і яго партнёры па камандзе парасківалі іх рэчы ў раздзявальні. У выніку пасля мноства скаргаў ад удзельнікаў і гледачоў арганізатары прынялі рашэнне дыскваліфікаваць іх».

Пазней Фрай папрасіў прабачэння за свае паводзіны.

**Блізкая ўлада**

## Размовы па сутнасці

**Адміністрацыя Прэзідэнта Беларусі працягвае на планавай аснове ажыццяўляць выязныя прыёмы грамадзян і юрыдычных асоб у рэгіёнах. Чарговыя сустрэчы запланаваны на 27—29 лістапада ў Віцебскай, Гомельскай і Мінскай абласцях, а таксама ў Мінску, паведамляе БелТА.**

Так, **27 лістапада** памочнік Прэзідэнта — інспектар па Гомельскай вобласці Юрый Вітольдавіч Шулейка правядзе прыём **у Рэчыцкім райвыканкаме з 11.00 да 13.00, а з 10.00 да 11.00** — прамую лінію. Начальнік аддзела аналізу і кантролю галоўнага ўпраўлення па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб Ігар Іванавіч Калінін у гэты ж дзень прыме грамадзян у **адміністрацыі Фрунзенскага раёна з 10.00 да 13.00.**

Начальнік галоўнага ідэалагічнага ўпраўлення Вольга Аляксандраўна Шпілеўская **28 лістапада** правядзе прыём грамадзян **у Стаўбцоўскім райвыканкаме,** намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення па рабоце са зваротамі грамадзян — загадчык асабістага прыёму Ігар Андрэевіч Ламаносаў **29 лістапада — у Пастаўскім райвыканкаме з 10.00 да 13.00.**

Запісацца на прыём можна па тэлефонах аддзелаў па рабоце са зваротамі грамадзян адпаведных выканаўчых камітэтаў.




# Салдацкая каша прыйшлася даспадобы

**Фестывалем палявых кухняў і рэканструкцыяй падзей лістапада 1943 года ў Гомелі адзначылі 75-ю гадавіну вызвалення горада над Сожам ад фашысцкіх захопнікаў. Ён стаў першым абласным цэнтрам Беларусі, вызваленым ад акупантаў. Гэта адбылося 26 лістапада 1943 года. Войскам Беларускага фронту пад камандаваннем генерала Канстанціна Ракасоўскага салютавала Масква.**



Сёлета на беразе Сожа разгарнулася ваенна-гістарычная рэканструкцыя — прыблізна там, дзе ў лістападзе 43-га перадавыя атрады Чырвонай Арміі фарсіравалі перашкоду і замацаваліся на беразе да падыходу асноўных сіл. **Кіраўнік клуба «Гонар мундзіра» Уладзімір КОЛАТЫ** адзначыў, што ўсе сто чалавек, якія сталі ўдзельнікамі рэканструкцыі, — ваенныя гісторыкі з Гомеля і іншых рэгіёнаў Беларусі, а таксама з Бранска, Санкт-Пецярбурга і Масквы:

— Кожны вывучаў вядомыя на сёння факты аб правядзенні Гомельска-Рэчыцкай вызваленчай аперацыі. Уся тэхніка, якую ў зімовых умовах змаглі паставіць на ход і завесці, — а гэта больш за дзесяць адзінак — выкарыстоўвалася ў той час. Аўтамабіль ГАЗ-67 наогул быў знойдзены на гомельскай зямлі, так што, магчыма, удзельнічаў у баях 75 гадоў таму.

Сёлета рэканструктары рэалізавалі два сцэнарыі. Гамяльчанам паказалі бой партызанаў з гарнізонам фашысцкага вузла сувязі на скрыжаванні дарог, падчас якога атрымалася адбіць у акупантаў і вывесці ў бяспечнае месца мірнае насельніцтва. Пасля гледачы ўбачылі вызваленне абласнога цэнтра і ўзніманне Чырвонага сцяга над пакінутымі фашыстамі акопамі.

Палявыя кухні размясцілі на пляцоўцы каля медыцынскага ўніверсітэта. Кухары-рэканструктары прыгатавалі для гамяльчан духмяныя стравы па спецыяльных рэцэптах. У меню — супы, кашы і чай, вельмі набліжаныя да рацыёну байцоў Чырвонай Арміі. Для гасцей гучалі франтавыя песні. Тут жа можна было азнаёміцца і з выстаўкай ваеннай тэхнікі і ўзбраення.

Ва ўсіх раёнах горада, а таксама ўстановах адукацыі і культуры прайшлі мітынгі, цырымоніі ўскладання вянкоў і ўрачыстыя мерапрыемствы, прысвечаныя 75-годдзю вызвалення Гомеля.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

### Да ведама

Гомельска-Рэчыцкая аперацыя завяршылася 30 лістапада. У выніку яе правядзення войскі Беларускага фронту прарвалі абарону праціўніка на паласе шырынёй 100 км, прасунуліся на захад на 130 км, стварылі пагрозу паўднёваму флангу групы войскаў «Цэнтр» і ўскладнілі яе ўзаемадзеянне з групай войскаў «Поўдзень». Злучэнні Беларускага фронту дасягнулі лініі Чавусы, Новы Быхаў, на ўсход ад Рагачова і Мазыра, на поўдзень ад Ельска. Тут фронт стабілізаваўся да 1944 года. У выніку правядзення аперацыі былі створаны спрыяльныя перадумовы для далейшага вызвалення Беларусі.

# «ЗАПАЛІЛІ» НА ЎСЕ СТО!

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Калі музычныя прафесіяналы аддалі перавагу вельмі якаснаму і «дарослаdensamu» выступленню аўстралійскай канкурсанткі Джаэль, якой у спіну дыхалі саперніцы з Мальты і Грузіі, то сімпатыі гледачоў вывелі на лідзіруючыя пазіцыі іншых удзельнікаў — дзяўчат з Польшчы і Францыі. А перамогу і галоўны прыз — хрустальны мікрафон — атрымала менавіта прадстаўніца Польшчы. Раксана Венгель з песняй «Anyone I Want to Be» набрала выніковыя 215 балаў і абышла Анжэліну Нава з Францыі, у якой 205 балаў, і Джаэль з Аўстраліі, якая атрымала 201 бал.

«У Раксаны быў вельмі энергічны і яркі нумар, яна ўпэўнена выступіла і заваявала сэрцы гледачоў, — зазначыў пасля фіналу **выканаўчы супервайзер дзіцячага «Еўрабачання» Ян Ола САНД.** — Наогул, мне вельмі прыемна, што гледачы былі такія актыўныя, падтрымліваючы фіналістаў, і што сёлета атрымалася такое відовішчнае, сапраўды грандыёзнае шоу». Адзначым, што ў кулуарах прадстаўнікі Еўрапейскага вяшчальнага саюза не раз называлі мінскі конкурс «найлепшым за ўсю гісторыю», — і гэта значыць, што планка, якую паставілі беларусы ў 2010-м, калі наша краіна першы раз прымала дзіцячае «Еўрабачанне», узнятая яшчэ вышэй.

У прэс-цэнтры пераможцу Раксану сустрэлі працяглымі апладысментамі і фотасесіяй, а потым закідалі пытаннямі: «Як адчуванні? Каму прысвячаеш перамогу? Хто быў тваім фаварытам на конкурсе?». Раксана ўсхваляваная, але па магчымасці поўна адказвала: «Я прысвячаю перамогу сваёй краіне, сваім бацькам і нашай дэлегацыі — калі б не ваша падтрымка, усіх вас, напэўна, такога выніку не было б. І я да апошняга моманту не магла паверыць, што перамагла. Адчуваю цяпер і суцэльны шок, і шчасце — па праўдзе, нават не ведаю, як выказаць словамі гэтыя эмоцыі. Усе ўдзельнікі былі настолькі моцныя, такія добрыя галасы і песні, што я не магу вылучыць кагосьці аднаго ці нават пяцярых — кожнаму з нас павінна была дастацца такая статуэтка!»

Раксане 13 гадоў. Спяваць яна пачала амаль выпадкова — у спартыўным летніку пайшла з сябрамі ў караоке, ды так усіх уразіла, што ёй прапанавалі заняцца музыкай і спевамі ўсур'ёз. Дэбютны сінгл юнай спявачкі «Zyj» выйшаў толькі сёлета, але ўжо налічвае больш за 8,8 мільёна праглядаў у сеціве. Акрамя таго, сёлета дзяўчына выйграла першы сезон польскага тэлешоу «Голас. Дзеці» і плануе запісаць дэбютны альбом, а таксама выступаць з канцэртамі. Паралельна яна працягвае займацца спортам: Раксана захапляецца акрабатыкай і танцамі, мае значныя поспехі ў дзюдо. І, вядома, марыць, каб наступнае «Еўрабачанне» прайшло ў Варшаве.

Калі гаварыць пра Беларусь, то перамога на «дамашнім» конкурсе, безумоўна, наўрад ці была магчымая. Аднак сярод рэкорднай колькасці ўдзельнікаў Даніэль Ястрэмскі не згубіўся і выглядаў сярод усіх моцных супернікаў цалкам годна, па-еўрапейску. Словам, 11-е месца Беларусі — наогул не пройгрыш, і, відаць, дзеці, якія абдымаліся і віншавалі адно аднаго на сцэне і ў закуліссі, гэта выдатна зразумелі. Што да дарослых, то высокія ацэнкі беларускі канкурсант атрымаў ад прафесійнага журы Арменіі, Партугаліі, Мальты, Нідэрландаў і Азербайджана. Са свайго боку, беларускае журы паставіла найвышэйшыя балы Аўстраліі (12), Мальце (10) і Францыі (8).

А што далей? Па добрай завядзёнцы за дзецьмі ў чарговы еўравізійны паход выпраўляюцца дарослыя выканаўцы. «Дайце толькі крыху перавесці дух, і зусім хутка мы гатовыя будзем расказаць пра нацыянальны адбор да дарослага конкурсу», — абяцае **генеральны прадзюсар шоу, старшыня Белтэлерадыёкампаніі Іван ЭЙСМАНТ.**

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

## Дабрачыннасць

# Ахвяраваць на добрую справу... праз смартфон

**life :) адкрыў USSD-нумары для дабрачыннай дапамогі. Дзякуючы гэтай паслузе ў абанентаў мабільнага апаратара з'явілася магчымасць усяго ў два клікі падтрымаць дабрачынныя і валанцёрскія арганізацыі, сацыяльныя платформы.**

Пералічыць сродкі на карысць адной з арганізацый можна двума спосабамі: набраць на сваім тэлефоне * 222 # і выбраць са спіса меню нумар арганізацыі, на карысць якой будзе здзейснены плацеж. Ці набраць на сваім смартфоне адзін з адмысловых кароткіх кодаў:

Беларускі дзіцячы хоспіс — * 222 * 1 #
«БлагоДарим» — * 222 * 2 #
«SOS — Дзіцячыя вёскі» — * 222 * 3 #
Магілёўскі дзіцячы хоспіс — * 222 * 4 #
Цэнтр дапамогі аўтычным дзецям — * 222 * 6 #
«ЮніХэлп» — * 222 * 7 #
Дабрачынны фонд «Шанс» — * 222 * 8 #
Сацыяльна-дабрачынная ўстанова «Центр ПОРА» — * 222 * 11 #
Установа «ІмёныМедыя»— * 222 * 12 #
Пошукава-выратавальны атрад «Анёл»— * 222 * 13 #
Цэнтр дапамогі жыццю — * 222 * 14 #

Пры любым спосабе пералічэння сродкаў сэрвіс прапануе абанентам выбраць суму ахвяравання: 1, 2 ці 5 беларускіх рублёў.

Як падкрэслівае **намеснік генеральнага дырэктара life :) Мурат АЛТУНТАШ,** кампанія life :) імкнецца не заставацца ўбаку ад сацыяльных праблем: «Мы ўпэўненыя, што дапамога не бывае маленькай. Таму далі нашым абанентам магчымасць садзейнічаць дабрачынным арганізацыям і ўсім тым, хто мае ў гэтым патрэбу».

Ахвяраваць на дабрачыннасць могуць абаненты ўсіх тарыфных планаў life :) для фізічных асоб, акрамя тарыфу «Свабодны», USSD-запыты меню * 222 # не тарыфікуюцца.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## Надвор'е

# Суха і марозна

### У другой палове тыдня пахаладае. Уначы — да мінус 18 градусаў

**У апошнія дні лістапада тэрыторыя краіны апынецца пад уплывам скандынаўскага антыцыклону, сфарміраванага ў халоднай паветранай масе. Будзе пераважна без ападкаў, але чакаецца марознае надвор'е, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

У сераду будзе без істотных ападкаў. На некаторых участках дарог захаваецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы будзе ад мінус 5 да мінус 11 градусаў, пры праясненнях яна апусціцца да 14 марозу. Удзень, па падліках сіноптыкаў, будзе ад мінус 1 да мінус 7 градусаў. Без істотных ападкаў прагназуецца і чацвер. На асобных участках дарог магчыма галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе 8—15 марозу, месцамі паветра астудзіцца да мінус 18 градусаў, днём будзе мінус 2—9 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пятніцу зноў будзе без ападкаў. На асобных участках дарог магчыма галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 7 да мінус 14 градусаў, па ўсходзе — 15—18 марозу. Удзень чакаецца 2—8 градусаў ніжэй за нуль.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## Актуальна

# Рыхтуем аўто да зімы

**Учора ў Бабруйскім раёне каля вёскі Баравая, на 32-м кіламетры аўтадарогі Бабруйск — Мазыр, адбылася аварыя, у якой загінула пасажырка.**

Кіроўца БМВ X5 з-за ўмоў надвор'я не разлічыў хуткасць руху. Як паведамілі ў ДАІ, ён не справіўся з кіраваннем і выехаў на сустрэчную паласу, дзе сутыкнуўся з аўтамабілем «Сітраен». У выніку ДТЗ 28-гадовая пасажырка «Сітраена» памерла на месцы. 26-гадовы кіроўца гэтага ж аўтамабіля і 15-гадовы пасажыр атрымалі шматлікія траўмы. Кіроўца БМВ і яго 20-гадовая пасажырка таксама былі траўмаваныя. Усе пацярпелыя дастаўлены ў бальніцу. Як адзначылі ў ДАІ, на БМВ былі ўстаноўлены летнія шыны...

**Старшы інспектар па асаблівых даручэннях УДАІ МУС Станіслаў САЛАВЕЙ** паведаміў, што з 26 лістапада да 6 снежня праводзіцца рэспубліканская прафілактычная акцыя для папярэджання і прафілактыкі ДТЗ у зімовы перыяд. Супрацоўнікі ДАІ выступяць у калектывах і аўтатранспартных арганізацыях, каб нагадаць аўтаўладальнікам аб правілах бяспекі на зімовай дарозе.

Прадстаўнік Дзяржаўтаінспекцыі падкрэсліў, што дастатковая вышыня пратэктара павінна быць на кожнай восі аўто. Звычайна, калі шыны на адной з восяў знасіліся, то кіроўца ставіць новую гуму на вядучую вось. Аўто, як правіла, пярэднепрывадныя. І што атрымліваецца? У аварыйнай сітуацыі кіроўца цісне на педаль тормазу, пярэднія шыны тармозяць добра, а заднія слізгаюць. І аўтамабіль разварочвае. Гэта адно з самых тыповых ДТЗ. Таму трэба сачыць за тым, каб знос шын на кожным коле быў прыкладна аднолькавы.

З першага дня каляндарнай зімы інспектары ДПС правядуць рэйды, падчас якіх праверацьць, як кіроўцы падрыхтавалі свае аўтамабілі да эксплуатацыі зімой. Зімовыя шыны ўстанаўліваюцца на ўсіх колах транспартнага сродку. Пры куплі неабходна звяртаць увагу на маркіроўку шын. Шыны павінны быць прамаркіраваны знакам у выглядзе горнай вяршыні з трыма пікамі і са сняжынкай унутры яе альбо знакамі «M+S», «M&S», «M. S», «M S» або «All seasons». Пры гэтым рэшткавая вышыня малюнка пратэктара павінна быць не менш за 4 міліметры. За ўдзел у дарожным руху транспартных сродкаў, не абсталяваных зімовымі шынамі, прадугледжана адміністрацыйная адказнасць у выглядзе папярэджання або штрафу да пяці дзясятых базавай велічыні.

**Сяргей КУЛАКОЎ.**

# У аварыі пацярпелі пяцёра

У вячэрнім тумане на трасе М10 недалёка ад Кобрына здарылася лабавое сутыкненне. 57-гадовы жыхар Драгічынскага раёна на «Фольксвагене» вырашыў здзейсніць абгон папутнага аўтамабіля. Але ў вячэрнім тумане не разгледзеў сустрэчнай машыны і ўрэзаўся ў «Форд» на сустрэчнай паласе. За рулём апошняга сядзела 34-гадовая брастаўчанка. У машыне таксама былі яе сястра, муж і двое дзяцей, дзяўчынка 14-ці гадоў і 7-гадовы хлопчык. Усе пяцёра атрымалі траўмы і былі дастаўлены ў бальніцу. Мяркуемы віноўнік аварыі не пацярпеў. А супрацоўнікі Дзяржаўтаінспекцыі бясконца папярэджваюць, што ва ўмовах туману трэба зніжаць хуткасць і лепш адмаўляцца ад абгонаў.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

Агульны клопат

# ІНДЭКС ДАБРЫНІ

## Наколькі беларускі бізнес сацыяльна адказны?

**Кампанія Huawei штогод накіроўвае частку свайго прыбытку на аблічбоўку медыцынскіх даных. А шведскі вытворца мэблі Ikea запусціў праграму стажыроўкі для бежанцаў. Падключэнне бізнесу да вырашэння сацыяльных праблем становіцца модным. Ці прыжылася гэта тэндэнцыя ў нас? Як беларускія прадпрыемствы ўдзельнічаюць у жыцці грамадства і што можа падштурхнуць іх да большай актыўнасці, абмяркоўвалі на публічных слуханнях у Мінску.**

### Новая хваля фінансавых тэхналогій



Акцыя «Бягучыя гарады».

Нядаўна ў нашай краіне правялі даследаванне сацыяльнай адказнасці бізнесу. Быў вывучаны вопыт 32 кампаній з розных сфер: лагістыка, IT, прамысловасць, фінансы, гандаль, будаўніцтва. Аказалася, найбольш увагі аддаецца такім кірункам, як добрае здароўе і дабрабыт (прадпрыемствы стараюцца развіваць спорт, заахвочваць да здаровага ладу жыцця) і якасная адукацыя (напрыклад, работа са студэнтамі). Многія таксама імкнуцца забяспечваць годную працу (для спецыялістаў арганізуюць вольны час, адпраўляюць іх на павышэнне кваліфікацыі) і адказнае спажыванне і вытворчасць. А вось пытаннямі чыстай вады і змяншэння няроўнасці амаль не займаюцца.

Дапамагаць вырашаць сацыяльныя праблемы бізнес можа не толькі праз дабрачыннасць. Больш сучасны інструмент — імпакт-інвестыцыі. Іх мэта — атрымаць і сацыяльны, і экалагічны эфект, і фінансавую аддачу. Праект мусіць быць акупным.

Гэта новая хваля фінансавых тэхналогій. Напрыклад, ёсць фонд «Чыстае неба». Ён дае грошы пад меншыя працэнты, чым банкі, але з умовай, што праект, на які выдзяляюцца інвестыцыі, дапаможа зменшыць выкід парніковых газаў.

— Цікавы інструмент, які ёсць у шэрагу краін, — аблігацыі сацыяльнага ўздзеяння. Як гэта працуе? Прыватнік забяспечвае капіталам праграму ці паслугу, а эканомія бюджэту, атрыманая ў выніку дзяржавай, ідзе на вяртанне інвестыцый. Даход залежыць ад выніку, — расказвае **кансультант ПРААН Таісія ЯЛЕЦКІХ.**

У свеце расце колькасць стартапаў, якія асноўнай мэтай выбіраюць добрыя справы і пры гэтым зарабляюць грошы. Сярод іх ёсць і беларускія — напрыклад, мабільная праграма для жаночага здароўя Flo, анлайн-платформа для дакладнага земляробства OneSoil (дазваляе павысіць прадукцыйнасць сельскай гаспадаркі і эканоміць грошы фермераў пры дапамозе камп'ютарных тэхналогій), праект па дыягностыцы хвароб па фота вокавага дна Deep Dee.

### Хуткія касіры

Падчас публічных слуханняў айчынныя кампаніі падзяліліся прыкладамі сацыяльнай адказнасці. Так, Беларусбанк ужо дзесяць гадоў рэалізуе праект «Бацькоўскі дом». Яго мэта — стварыць альтэрнатыву інтэрнатам і паспрыяць сацыялізацыі дзяцей-сірот. За гэты час было пабудавана 16 катэджаў, дзе ў прыёмных сем'ях жывуць 153 хлопчыкі і дзяўчынкі. Сем'і засяляюцца ў дамы (плошчай больш за 200 квадратных метраў) цалкам абсталяваныя тэхнікай і мэбляй, з вялікімі гульнявымі пакоямі. З улікам пажаданняў бацькоў, некаторым сталі набываць аўтамабілі, каб яны маглі вазіць дзяцей у садок, школу, разам падарожнічаць па Беларусі.

Дапамагаць дзецям і адначасова папулярызаваць здаровы лад жыцця спрабуе мабільны аператар velcom. Ён праводзіць акцыю «Бягучыя гарады», у якой могуць удзельнічаць як прафесійныя атлеты, так і аматары. Чым больш кіламетраж яны набегаюць, тым больш грошай кампанія пераводзе на дабрачыннасць. Сёлета фонд склаў 165 тысяч рублёў. Дапамогу атрымалі абласныя дзіцячыя цэнтры медыцынскай рэабілітацыі. Сярод спартыўных рэкордаў акцыі — самы масавы забег у Гомелі, дзе на старт выйшла тысяча чалавек. А самы доўгі забег быў у брастаўчаніна — 108 кіламетраў і 12 гадзін.

Каб падтрымаць спартсменаў з праблемамі зроку, кампанія Volkswagen сёлета правяла турнір Беларусі па інтуітыўным футболе. Падрыхтоўка цягнулася больш за паўгода. У спаборніцтвах удзельнічалі і прафесійныя гульцы — з завязанымі вачыма.

— Мы вельмі баяліся фразы «піяраца на інвалідах», якую засяцілі ў рэпутацыйныя рызыкі, — прызнаюцца ў аўтацэнтры. — Таму дэтальна распрацавалі камунікацыйную стратэгію.

Камандам аказалі матэрыяльную падтрымку: набылі інвентар і форму для 156 спартсменаў. А пасля дапамаглі зборнай нашай краіны па футболе сярод невідушчых з'ездзіць на турнір Еўропы ў Польшчу. У планах аўтакампаніі — і далей працаваць з гэтай тэмай. Напрыклад, у Мінску і Віцебску яны хочуць абсталяваць агучаныя маршруты для людзей з праблемамі зроку.

Варыянт таго, як забяспечыць работай гараджан з парушэннямі слыху, прапанавала гандлёвая сетка «Суседзі». Іх праект называецца «Ціхія касы».

— Мы вывучалі, як палепшыць сэрвіс, і апытвалі пакупнікоў, што для іх важна. 70 працэнтаў адказала, што ім падабаецца ціхае і хуткае абслугоўванне. Тады мы ўспомнілі, што ёсць замежны вопыт, калі за касай працуюць інваліды па слыху, і вырашылі зрабіць тое ж самае. Перагледзелі цалкам сваю праграму навучання, прадумалі адаптацыю на рабочых месцах, — дзеліцца прадстаўнік гандлёвай сеткі.

**У свеце расце колькасць стартапаў, якія асноўнай мэтай выбіраюць добрыя справы і пры гэтым зарабляюць грошы. Сярод іх ёсць і беларускія.**

Сёння «ціхіх» касіраў 35. І ніякіх страт у якасці сервісу. Наадварот: гэтыя работнікі абслугоўваюць пакупнікоў на два працэнты хутчэй. Яны працуюць у гіпермаркетах, дзе вялікая плынь кліентаў, і спраўляюцца.

Складанасці таксама ёсць. Напрыклад, у камунікацыі. Адміністрацыя перапісваецца з новым персаналам па Viber, але трэба ўлічваць, што інваліды па слыху могуць не зразумець складаныя сказы, блытаць канчаткі і склоны. Іншы момант — бацькі «ціхіх» касіраў. Некаторыя занадта апякуюцца над сваімі ўжо дарослымі дзецьмі і не былі гатовы адпусціць іх на работу — нават на гутарку хадзілі з імі разам.

### Не абавязацельства, а магчымасць

Як ацаніць, наколькі беларускі бізнес сацыяльна адказны? З наступнага года прапануецца ўвесці індэкс «дабрыні».

#### Афіцыйна

**Мар'яна ШЧОТКІНА, намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу:**

— Сярод 17 Мэт устойлівага развіцця галоўная — партнёрства: толькі так можна дасягнуць прагрэсу. Чаму важная роля бізнесу? Гэта прыцягненне капіталу. За кошт аднаго бюджэту ўсіх праблем не вырашыць. А бізнес павінен быць зацікаўлены, бо для кампаній важны іх імідж. У той жа Германіі ідзе канкурэнцыя за ўдзел у сацыяльным праекце.

— Трэба дадаць канкурэнтны элемент і паспрабаваць аблічбаваць гэтую сферу, — каментуе ініцыятыву **дырэктар мясцовага фонду «Добра» Аляксандр СКРАБОЎСКІ**. — Індэкс не прэтэндуе на вычарпальную ацэнку — для гэтага існуюць міжнародныя прафесійныя сістэмы сертыфікацыі. Але ён дазволіць непадрыхтаванаму чалавеку суаднесці высілкі і заявы кампаній у адносінах удзелу ў жыцці грамадства.

Інфармацыя будзе збірацца з адкрытых крыніц. Прадпрыемства зможа атрымаць ад нуля да дзесяці балаў. Ацэньваць плануюць па чатырох крытэрыях: працоўныя практыкі і правы чалавека, навакольнае асяроддзе, добрасумленныя дзелавыя практыкі, спажыўцы і ўдзел у жыцці грамадства. Пасля справаздачу накіруюць адміністрацыі кампаніі і дадуць тры тыдні на рэагаванне.

Адзнакі выкладуць у агульны доступ. Раз на год будуць выводзіць таксама абагульнены індэкс сацыяльнай адказнасці, каб паказаць сітуацыю ў сферы ў цэлым.

Да канца года ўкараненне індэкса яшчэ абмяркуюць з экспертамі. З папярэднім спісам крытэрыяў можна азнаёміцца на сайце fonddobra.by.

Аляксандр Скрабоўскі мяркуе, што сацыяльная адказнасць — гэта не абавязацельства для бізнесу, а магчымасць: новыя рынкі, новыя бізнес-мадэлі.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**

# НАПІСАНАМУ ВЕРЫЦЬ



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Цяпер, калі банкі для прыцягнення кліентаў будуць зніжаць працэнты па крэдытах, гэта будзе сапраўднае зніжэнне, а не падманлівае. І калі праз нейкі час нам прапануюць прадукт пад 14 працэнтаў, то напісанаму можна верыць.

Тая ж самая гісторыя з дэпазітамі.

Амаль адразу ж зменшыліся першапачатковыя працэнты па ўсёй лінейцы сярэднетэрміновых і кароткатэрміновых дэпазітаў. Дакладней, яны сталі сумленнымі.

Дарэчы, банкі павінны клапаціцца аб сваіх кліентах і нагадваць аб праблемных крэдытах. Фінансавыя інстытуты абавязаны паведамляць кліентам пра пратэрмінаваную запазычанасць па крэдыце не пазней чым праз 30 дзён з дня яе ўтварэння, а паручыцелям — не пазней чым праз 60 дзён. Гэтую інфармацыю банкі павінны даваць спажыўцу бясплатна.

### Колькі каштуе кілаграм і літр?

Калі ўмовы хаджэння грошай у нас акрэслівае Нацбанк праз нормы Банкаўскага кодэкса, то МАРГ змяняе правілы продажу асобных тавараў і работу сферы грамадскага харчавання.

Напрыклад, на кожным харчовым тавары будзе кошт за літр і кілаграм — і мы будзем дакладна разумець, які кефір на самай справе самы танны, а дзе маркетолагі былі проста хітрэйшыя.

Пастанова Саўміна ад 14 лістапада № 824 прадугледжвае карэкціроўку правілаў продажу асобных відаў тавараў і ажыццяўлення грамадскага харчавання. Дакумент уступае ў сілу праз тры месяцы пасля яго афіцыйнага апублікавання, але галоўная змена ўжо працуе на практыцы. Многія крамы ўжо ўказваюць на цэнніках кошт тавару за кілаграм і літр. Выключэнне — тавары ў пэўным наборы, алкагольныя, слабаалкагольныя напоі і піва, яйкі, а таксама іншыя харчовыя прадукты, маса або аб'ём якіх складае менш за 50 грамаў або 50 мілілітраў.

### Галоўнае не ў камп'ютары, а на цэнніку

Гандлёвыя цэнтры і крамы павінны будуць прадаваць тавары па тых цэнах, якія пазначаны на цэнніках. Змяненні ўвялі, каб «зняць канфлікты пакупнікоў з прадаўцамі ў выпадках, калі пры разліку на касе да ведама пакупніка даводзяць, што цана на тавар павялічылася, але «не паспелі перапісаць цэннікі».

Такім жа чынам праблемныя пытанні здымаюцца ў кафэ і сталовых. Там прадукцыю грамадскага харчавання абавязаны адпускаць па той цане, якая паказана ў меню. Выключэнне — выпадкі продажу тавараў па больш нізкай цане.

Яшчэ крамы абавязаны выстаўляць аднолькавыя цэны пры аплаце тавару як наяўнымі, так і безнаяўнымі грашыма.

### Упакоўка. Бясплатная і якасная

Сёння ў кожным гандлёвым пункце згодна з правіламі гандлю павінна быць бясплатная ўпакоўка. Цяпер дадаецца новае патрабаванне: бясплатная ўпакоўка павінна «забяспечваць захаванне якасці і спажывецкіх уласцівасцяў тавараў». Дарэчы, у цягніках — міжнародных, міжрэгіянальных ліній і рэгіянальных ліній бізнес-класа — дазволяць разносны гандаль харчовымі прадуктамі. Галоўнае патрабаванне — выкананне ўстаноўленых заканадаўствам умоў іх захоўвання і продажу.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Мая радзіма — мой гонар

# БРАГІН ЗМЯНІЎ АБЛІЧЧА

## Гарадскі пасёлак на поўдні краіны да абласнога свята «Дажынкі-2018» абнавіўся і папрыгажэў

**Капрамонт праведзены ў многіх важных установах сацыяльнага прызначэння: у сярэдняй школе, школе мастацтваў, Палацы культуры, музеі, цэнтральнай бальніцы... Многія вуліцы добраўпарадкаваны — там пакладзены тратуар і новае пакрыццё. Своеасаблівай візітнай карткай райцэнтра стала Алея Герояў. Цяпер каля мемарыяльнага комплексу, які ўвекавечыў памяць байцоў, што аддалі жыццё за свабоду гэтага краю, будуць праводзіць урачыстыя мерапрыемствы.**

Для аматараў здаровага ладу жыцця адкрыты новы спартыўна-аздараўленчы комплекс — адначасова тут могуць займацца больш за 100 чалавек. У будынку ёсць спецыялізаваныя залы для заняткаў вольнай барацьбой, лёгкай і цяжкай атлетыкай, зала шэйпінгу. Створаны пляцоўкі для гульнявых відаў спорту — валейбола, гандбола, баскетбола і мініфутбола. На другім паверсе будынка размясцілася раённая бібліятэка.

Маладыя спецыялісты раёна могуць без хваляванняў за быт жаніцца і выходзіць замуж. Для іх у Брагіне пабудавана 20 утульных дамоў. Адначасова завершаны бягучы рамонт 25 шматпавярховак. У цэнтральным парку цяпер ёсць свой амфітэатр і дзіцячы казачны замак. А некалі забалочаная тэрыторыя па вуліцы Паркавайператварылася ў прыгожы парк з вадаёмам, дзе пракладзена экалагічная сцежка. Восенню паспелі адрэстаўрыраваць і здаць будынак мясцовага аўтавакзала.

Між тым пераўтварэнні закранулі і Камарын — гарадскі пасёлак, з якога ў 1943-м пачалося вызваленне Беларусі ад фашысцкіх захопнікаў. Новыя фасады тут набылі культурна-спартыўны цэнтр і філіял Брагінскай дзіцячай школы мастацтваў. Завершаны рамонт і ўладкаванне тэрыторыі сярэдняй школы, абноўлена ўчастковая бальніца.



Старшыня Гомельскага аблвыканкама Уладзімір ДВОРНІК падчас узнагароджвання перадавікоў жніва.

Сёлетнія «Дажынкі» ў Брагіне былі прысвечаны Году малой радзімы і прайшлі пад дэвізам — «Мая радзіма — мой гонар». Першымі тысячнікамі Гомельскай вобласці сталі камбайнеры агракамбіната «Холмеч» Рэчыцкага раёна Іван Вырвіч і Алег Хвост. Іх намалот разам з кукурузай склаў амаль 6,7 тысячы тон. Сярод маладзёжных экіпажаў у лідарах Сяргей Карпенка і Андрэй Кульманскі з «Ціхінічаў» Рагачоўскага раёна. Сярод сельскагаспадарчых арганізацый па вытворчасці збожжа найлепшым названа камунальнае сельскагаспадарчае унітарнае прадпрыемства «Саўгас-камбінат «Зара» Мазырскага раёна.

**Старшыня Гомельскага аблвыканкама Уладзімір ДВОРНІК** падкрэсліў, што сельская гаспадарка застаецца ключавой галіной эканомікі Гомельшчыны:

— Прадпрыемствы аграпрамысловага комплексу з пачатку года адправілі на экспарт прадукцыі на суму 280 мільёнаў долараў. Доля экспарту прадпрыемстваў рэгіёна ў агульным аб'ёме краіны складае практычна пятую частку.

Кіраўнік вобласці адзначыў неабходнасць перабудаваць сельскагаспадарчую вытворчасць такім чынам, каб атрымліваць максімальны эканамічны эфект нават у складаных умовах надвор'я.

Дарэчы, ураджай збожжавых на Гомельшчыне сёлета склаў амаль 1 мільён тон. (На такі вынік паўплывала кукуруза, ураджай якой перавысіў леташні амаль у два разы.) Самы вялікі ўнёсак у абласны каравай зрабілі гаспадаркі Буда-Кашалёўскага, Рэчыцкага, Гомельскага, Рагачоўскага і Мазырскага раёнаў.

Да канца гэтага года на Гомельшчыне будуць уведзены ў эксплуатацыю чатыры сучасныя малочнатаварныя комплексы. Яшчэ на 13 завяршаецца рэканструкцыя і тэхнічнае пераабсталяванне.




Перадавік жніва з Лельчыцкага раёна Мікалай БЯЛЬКОВІЧ.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

Каб памяталі

# ВЯЛІЗНАЕ НЕБА УЛАДЗІМІРА КАРВАТА

**Напэўна, чытачы знаёмыя з пранізлівай патрыятычнай песняй «Вялізнае неба» (аўтар слоў Роберт Раждзественскі, музыка Аскара Фельцмана) у выкананні Эдзіты П'ехі. Песня заснавана на рэальных падзеях і прысвечана подзвігу ваенных лётчыкаў групы савецкіх войскаў у Германіі — «выдатных хлопцаў выдатнай зямлі», якія цаной свайго жыцця ўратавалі ад гібелі горад, на які павінен быў упасці іх самалёт, што загарэўся. Пілоты маглі катапультавацца, але не пакінулі машыну, а зрабілі ўсё магчымае, каб «дацягнуць» яе да лесу — за межы жылых кварталаў, хоць цудоўна ўсведамлялі, што рызыкуюць уласным жыццём.**

**23 мая 1996 года трагічны сюжэт гэтай песні амаль дакладна паўтарыўся ў рэальнасці на беларускай зямлі, у Баранавіцкім раёне. У гэты дзень, ратуючы ад гібелі беларускую вёску, ахвяраваў сваім вялізным небам і сваім жыццём выдатны лётчык і выдатны хлопец Уладзімір Карват. 28 лістапада 2018-га яму споўнілася б 60 гадоў.**

Уладзімір нарадзіўся ў Брэсце. Амаль усё ў жыцці будучага першага Героя Беларусі было, як ва ўсіх яго аднагодкаў, якія вучыліся разам з ім у адной са школ абласнога цэнтра. Як успамінаюць педагогі, аваладваў навукамі Валодзя лёгка і ахвотна, хоць выдатнікам быць не імкнуўся. Вылучаўся хіба што сваёй спартыўнасцю, горача любіў футбол — трэнеры нават прадказвалі яму добрую футбольную кар'еру ў камандзе майстроў. Але Карват марыў пра неба. Аднойчы на класную гадзіну да іх прыйшоў лётчык, які расказаў пра службу ў авіяцыі, пасля чаго настаўнік папрасіў хлопцаў адлюстраваць тое, што запомнілася, адклалася ў памяці. Валодзя Карват намаляваў самалёт — відавочна, што пытання аб выбары прафесіі ў хлопца не было. Яго марам пра палёты наканавана было ажыццявіцца. На жаль, у яе аказаўся такі трагічны і разам з тым гераічны фінал.

У 1981 годзе ён скончыў Армавірскае вышэйшае ваенна-авіяцыйнае вучылішча



лётчыкаў. Яго накіравалі для праходжання службы на Далёкі Усход, дзе Уладзімір прайшоў шлях ад лётчыка да намесніка камандзіра палка па лётнай падрыхтоўцы. Лятаў на самалёце МіГ-23. У ваенным пасёлку Калінка Хабараўскага краю ён пражыў разам з сям'ёй 13 гадоў. Народу ў пасёлку было няшмат, таму ведалі адно пра аднаго амаль усё. Сям'я Карватаў лічылася дружнай, пра такіх сужэнцаў кажуць — «адно цэлае». Нарадзілася двое дзяцей — дачка і сын.

У жніўні 1994 года Карват прыбыў для праходжання службы ва Узброеныя Сілы Рэспублікі Беларусь. 11 верасня 1994-га прыняў прысягу на вернасць народу Беларусі. Быў прызначаны начальнікам паветрана-агнявой і тактычнай падрыхтоўкі 61-й знішчальнай авіяцыйнай базы ў Баранавічах. Напрацаваны да гэтага часу вялікі прафесійны вопыт дазваляў Карвату з першых дзён адчуваць сябе на новай пасадзе ўпэўнена і паспяхова спраўляцца з цяжкасцямі. Да таго ж па сваім характары ён быў чалавекам адкрытым, жыццярадасным, з добрым пачуццём гумару, тактоўным і далікатным, таму ў калектыве авіябазы яго адразу ж палюбілі.

23 мая 1996 года ў 22 гадзіны 54 хвіліны пры выкананні вучэбна-трэніровачнага палёту на самалёце СУ-27, пілатуемым падпалкоўнікам Карватам, узнік пажар, машына пачала губляць кіраванне і падаць. Самалёт на вышыні 900 метраў ляцеў з хуткасцю 540 км/гадзіну. Загарэлася табло папярэджання аб падзенні ціску ў першай гідрасістэме. Праз 29 секундаў гэтае паведамленне знікла, але неўзабаве з'явіліся сігналы аб іншых пашкоджаннях. На хуткасці 440 км/гадзіну перастала дзейнічаць сістэма кіравання. Кіраўнік палётаў даў лётчыку каманду на катапультаванне. Аднак, улічваючы тое, што на шляху палаючага самалёта знаходзіліся населеныя пункты Арабаўшчына і Вялікае Гацішча Баранавіцкага раёна, Уладзімір, нягледзячы на штосекундную небяспеку выбуху паветранага судна, прыняў мужнае рашэнне не дапусціць падзення машыны на жылыя дамы.

*И надо бы прыгать — не вышел полет,*
*Но рухнет на город пустой самолет,*
*Пройдет, не оставив живого следа.*
*И тысячи жизней, и тысячи жизней,*
*И тысячи жизней прервутся тогда.*

Чатырнаццаць секундаў палёту лётчык, выкарыстоўваючы любыя магчымасці ўздзеяння на самалёт, працягваў адводзіць яго ад вёскі. Па паказаннях «чорнай скрыні», ён практычна да апошняй секунды сціскаў рычагі кіравання, спрабуючы зрабіць немагчымае — падпарадкаваць машыну і адвесці яе ад вёскі. Пакуль яна, стаўшы ў апошняе імгненне на дыбкі, не ўпала на зямлю, пераляцеўшы вёску амаль на кіламетр. Гэта быў не проста кіламетр — з кожным яго метрам былі намёртва спаяны апошнія долі секунды жыцця выдатнага пілота, «выдатнага хлопца выдатнай зямлі» Уладзіміра Карвата. Дзякуючы лётнаму майстэрству і цаной уласнага жыцця лётчык не дапусціў падзення самалёта на населены пункт, чым выратаваў мноства чалавечых жыццяў.

*Стрела самолета рванулась с небес,*
*И вздрогнул от взрыва березовый лес.*
*Не скоро поляны травой зарастут,*
*А город подумал, а город подумал,*
*А город подумал: ученья идут.*

Прычынай катастрофы стаў пажар у адсеку левага хваставога абцякальніка, які раней лічыўся пажарабяспечным і не меў датчыкаў папярэджання аб узгаранні. Як потым напісалі ва ўзнагародным лісце: «За 14 секундаў да падзення самалёта лётчык далажыў, што машына не кіруецца, разам з гэтым становішча лётчыка ў кабіне пасля сутыкнення з зямлёй (левая рука на ручцы кіравання рухавіком і правая рука на ручцы кіравання самалётам) сведчыць, што тыя, апошнія 14 секундаў палёту падпалкоўнік Карват, выкарыстоўваючы мінімальныя магчымасці ўздзеяння на самалёт, працягваў адводзіць яго ўбок ад вёскі».

— Маючы магчымасць сачыць з 2009 года за тым, якія стратэгіі выпрацоўваюцца і рэалізуюцца ў адносінах да прыродаахоўнай дзейнасці і па пытаннях змянення клімату, заўсёды захапляўся сур'ёзнасцю падыходу Мінпрыроды ў справе клопату аб навакольным асяроддзі для будучых пакаленняў.

Ён таксама падкрэсліў, што сёння перад многімі краінамі стаяць сур'ёзныя задачы ў сувязі з рашэннем, прынятым Генасамблеяй ААН у канцы 2015 года, аб зацвярджэнні 17 Мэт устойлівага развіцця з 169 падмэтамі і 230 індыкатарамі:

— Іх колькасць сведчыць пра тое, наколькі складаны будзе працэс па іх дасягненні. Каб справіцца з гэтай задачай, кожная краіна мае патрэбу ў стварэнні выразнай арганізацыйнай базы і ўстойлівай палітычнай волі ў рэалізацыі МУР з улікам узроўняў развіцця і сацыяльных умоў асобнай дзяржавы.

Па словах **Гары ЛІІВА, старшыні Групы экспертаў па АРЭД,** вельмі важна, што пытанні дасягнення Мэт устойлівага развіцця становяцца складальнай часткай АРЭД. Многія краіны, дзе сёння праходзяць такія агляды, могуць больш актыўна вывучаць, як праведзеныя імі мерапрыемствы суадносяцца з мэтамі, прадугледжанымі ў Парадку дня да 2030 года, прапрацаваць пытанні інтэграцыі апошніх у розныя сферы: сельскую і лясную гаспадарку, прамысловасць і інш.

Падчас семінара эксперты разгледзелі механізмы рэалізацыі і маніторынгу МУР у краінах-удзельніцах. Так, у многіх з іх створаны спецыяльныя органы, адказныя за ажыццяўленне і маніторынг МУР, якія ўзначальваюць кіраўнікі ўрадаў; працуюць міжведамасныя рабочыя групы; ідзе ўзаемадзеянне з парламентамі. Удзельнікі семінара таксама адзначылі важнасць уключэння МУР у нацыянальныя і рэгіянальныя планы развіцця, прыцягнення грамадскасці да працэсу рэалізацыі Мэт.

**Вераніка КОЛАСАВА.**

Усё, што вы хацелі спытаць...

# ПРА НЕБЯСПЕКУ СТОЙКІХ АРГАНІЧНЫХ ЗАБРУДЖВАЛЬНІКАЎ

## Як пестыцыды і іншыя хімічныя рэчывы шкодзяць прыродзе і чалавеку?



**У таварах для дзяцей, што зроблены з другаснага пластыку ад старой электронікі, знайшлі два небяспечныя хімічныя рэчывы. Полібраміраваныя дыфенілавыя эфіры і гексабромцыклададэкан (вогнезасцерагальныя сродкі) адносяцца да стойкіх арганічных забруджвальнікаў (САЗ), але да гэтага часу трапляюць да нас на прылаўкі.**

### «СТОЙКАЯ» ПАГРОЗА

Што хаваецца за абрэвіятурай «САЗ», спытала «Звязда» ў **старшага навуковага супрацоўніка лабараторыі прафілактычнай і экалагічнай таксікалогіі НПЦ гігіены Святланы ПЯТРОВАЙ.**

— Сучасная інтэнсіўная прамысловасць і сельскагаспадарчая дзейнасць прывялі да з'яўлення высокатаксічных рэчываў і злучэнняў, многія з якіх надзвычай устойлівыя ў навакольным асяроддзі. Яны і называюцца стойкімі арганічнымі забруджвальнікамі. Пры гэтым такія рэчывы могуць выкарыстоўвацца не толькі наўмысна (як, напрыклад, пестыцыды), але і ўтварацца самаадвольна ў якасці пабочных прадуктаў згарання ці прамысловай дзейнасці (дыяксіны, фураны і г. д.). Важна, што такія хімікаты вельмі павольна раскладаюцца ў натуральных умовах, таму, трапляючы ў арганізм або экасістэму, затрымліваюцца там надоўга. Напрыклад, перыяд паўраспаду дыяксінаў у глебе ацэньваецца дзясяткамі гадоў.

***— Нядаўна BBC News паведаміла: у Францыі аднавілі расследаванне выпадкаў нараджэння дзяцей з цалкам або часткова адсутнымі верхнімі канечнасцямі, якія былі зафіксаваныя ў 2009—2014 гадах. Міністр салідарнасці і аховы здароўя Францыі Аньез Бузін мяркуе, што паталогію выклікалі пестыцыды. Ці сапраўды стойкія арганічныя забруджвальнікі могуць аказацца настолькі небяспечнымі для чалавека?***

— Насамрэч так. САЗ назапашваюцца ў тлушчавых тканках і перадаюцца праз харчовы ланцужок. Таму людзі, у рацыёне якіх прысутнічае шмат тлустага мяса, рыбы, малочных прадуктаў ці яек, знаходзяцца ў групе рызыкі. Адпаведна, праз матчына малако шкодныя рэчывы могуць перайсці да немаўляці, а праз плацэнту — да дзіцяці, якое яшчэ нават не нарадзілася. Бяспечнай канцэнтрацыі САЗ не існуе, яны могуць спраўкаваць сур'ёзныя захворванні, сярод якіх: парушэнні работы імуннай, эндакрыннай і рэпрадуктыўнай сістэм, ракавыя пухліны, прыроджаныя дэфекты ў дзяцей, неўролага-псіхіятрычныя расстройствы і г. д. Праблема ў тым, што стойкія арганічныя забруджвальнікі назапашваюцца ў арганізме і прадугадаць, калі гэты «пузыр» лопне, амаль немагчыма. Таму лепш за ўсё засцерагчы сябе ад кантакту з гэтымі рэчывамі.

### ВА ЎТЫЛЬ!

Стойкія арганічныя забруджвальнікі — праблема не адной краіны, у яе рашэнні зацікаўленыя многія. Каб аб'яднаць намаганні для барацьбы з небяспечнымі рэчывамі, у 2001 годзе была прынята, а ў 2004-м уступіла ў сілу Стакгольмская канвенцыя аб САЗ, у гэтым жа годзе да яе далучылася і Беларусь. Які ўнёсак наша краіна робіць у рашэнне глабальнай «хімічнай» праблемы, расказала **начальнік галоўнага ўпраўлення рэгулявання абыходжання з адходамі, біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Мінпрыроды Вольга САЗОНАВА.**

— У апошнія гады Мінпрыроды актыўна працуе над выкананнем палажэнняў канвенцыі, і мы ўжо дабіліся пэўных поспехаў. Так, усе непрыдатныя пестыцыды, якія знаходзіліся на складах часовага захоўвання, перапакаваны ў спецыяльную герметычную тару — пластыкавыя бочкі і металічныя кантэйнеры. Таксама дзякуючы міжнароднай дапамозе два гады таму міністэрства завяршыла ліквідацыю найбольш небяспечнага сховішча непрыдатных пестыцыдаў — Слонімскага. У планах — да 2020 года знішчыць Петрыкаўскае сховішча, а таксама на базе Комплексу па перапрацоўцы і захоўванні таксічных прамысловых адходаў Гомельскай вобласці стварыць пляцоўку па іх утылізацыі.

Акрамя гэтага, цэлы комплекс работ праведзены па інвентарызацыі абсталявання, якое змяшчае поліхларыраваныя біфенілы (ПХБ). Дарэчы, стварэнне завода па іх знішчэнні таксама плануецца. Калі гэтыя прадпрыемствы будуць уведзены ў работу, то за пяць гадоў мы пазбавімся ад непрыдатных пестыцыдаў (якіх зараз каля 10 тыс. тон) і адходаў, якія змяшчаюць ПХБ (іх 6 тысяч тон).

**«САЗ назапашваюцца ў тлушчавых тканках і перадаюцца праз харчовы ланцужок. Таму людзі, у рацыёне якіх прысутнічае шмат тлустага мяса, рыбы, малочных прадуктаў ці яек, знаходзяцца ў групе рызыкі».**

***— Як будуць працаваць заводы па ўтылізацыі небяспечных адходаў, калі свае запасы будуць знішчаны?***

— Мы будзем перапрацоўваць тут адходы першага — трэцяга класаў небяспекі, якія ўтвараюцца ў краіне. Цяпер мы аналізуем прадпрыемствы, якія маюць ліцэнзіі на перапрацоўку гэтай групы адходаў, і бачым, што не ўсе выконваюць неабходныя экалагічныя патрабаванні, а некаторыя працуюць неэфектыўна. Прывозіць САЗ з суседніх краін не плануецца.

### НЕ СПАЛЬВАЦЬ ПЛАСТЫК І ВЫЦІРАЦЬ ПЫЛ

Першапачаткова ў канвенцыю былі ўключаны дванаццаць САЗ, іх назвалі «брудным» тузінам. Але паступова гэты спіс пачаў папаўняцца новымі рэчывамі і злучэннямі. У цяперашні час небяспечных хімікатаў 28. Аднак «новыя» САЗ кантралююцца пакуль не вельмі добра. Так, напрыклад, апошняе даследаванне грамадзянскіх арганізацый паказала, што нават у дзіцячых таварах могуць знаходзіцца САЗ (у прыватнасці, полібраміраваныя дыфенілавыя эфіры і гексабромцыклададэкан). Чаму шкодныя кампаненты трапляюць у нашы тавары, расказаў **дырэктар Цэнтра экалагічных рашэнняў Яўген ЛАБАНАЎ.**

— На жаль, вытворцы сёння не пішуць склад з усімі дабаўкамі, насычэннямі і г. д. Больш за тое, яны і самі могуць не ведаць, што знаходзіцца ў тым жа пластыку (асабліва калі ён другасны). Менавіта таму сёння трэба ініцыяваць узмацненне жорсткасці пакасчыкаў для САЗ у адходах, каб яны не паступалі ў новыя тавары.

***— Што можа зрабіць звычайны чалавек, каб зберагчы сябе ад уздзеяння САЗ?***

— Самае простае: есці менш тлустага мяса і рыбы, ні ў якім разе не спальваць пластык (што правакуе выдзяленне дыяксінаў і г. д.) і часцей праводзіць вільготную прыборку.

**Кацярына ЦІТОВА.**

На варце прыроды

# «НАМ ЁСЦЬ КУДЫ РАСЦІ»,

## або Навошта на кантэйнерах для смецця малююць кветкі і герояў мультфільмаў



**«Мая праца падабаецца тым, што амаль адразу бачыш вынік. У большасці нашы людзі любяць свой горад, таму не смецяць, — кажа намеснік начальніка аддзела кантролю за абыходжаннем з адходамі Брэсцкага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Алёна БЯЗРУЧКА, імя якой занесена на Дошку гонару Мінпрыроды. — Зразумела, што з цягам часу нейкія аб'екты губляюць знешнюю прывабнасць, сям-там на прадпрыемствах нядбайна абыходзяцца з адходамі. Але мы робім усё магчымае, каб наша самая прыгожая зямля была і самай чыстай і бяспечнай».**

***— Нягледзячы на тое што правілы раздзельнага збору адходаў шырока прапагандуюцца не першы год, не ўсе людзі прытрымліваюцца іх. Ці ёсць нейкая статыстыка на гэту тэму?***

— Па нашых даных, больш за 80 % насельніцтва вобласці сартуюць адходы. Для гэтага створаны адпаведныя ўмовы: толькі сёлета ўстаноўлена больш за 10 тысяч кантэйнераў для раздзельнага збору адходаў, а ўсяго іх — 21 тысяча. Планава-рэгулярнай санітарнай ачысткай ахоплены ўсе населеныя пункты вобласці. З гэтай мэтай была арганізавана актуалізацыя ўсіх схем абыходжання з камунальнымі адходамі ў 16 раёнах вобласці і трох гарадах: Баранавічах, Брэсце, Пінску. У полі нашага зроку 688 садаводчых таварыстваў і 333 гаражныя кааператывы. Тут мы таксама актыўна працуем.

***— Заўважыла, што ў Брэсце да «смеццевага пытання» падыходзяць крэатыўна. Цешаць вока кантэйнеры, упрыгожаныя малюнкамі кветак, жывёл. Гэта неяк уплывае на чысціню ў горадзе?***

— Думаю, пэўная ўзаемасувязь ёсць. Няпроста было прывучыць людзей выкідаць адпрацаваныя элементы сілкавання ў спецыяльныя кантэйнеры. Але калі, напрыклад, на кантэйнеры намаляваны герой з мультфільма, то ўжо дзіця кантралюе, каб непатрэбную батарэйку выкінулі куды трэба. Збор адпрацаваных элементаў сілкавання ажыццяўляецца ў 356 стацыянарных пунктах, размешчаных у аб'ектах гандлю, адукацыі, на ўчастках ЖКГ. З пачатку года сабрана 6,8 тоны адпрацаваных батарэек.

Таксама ва ўсіх раёнах вобласці сумесна з ЖКГ створаны пункты збору ад насельніцтва і месцы часовага захоўвання адходаў, якія змяшчаюць ртуць. Сёлета сабрана 89 519 штук такіх прыбораў. Іх перапрацоўка ажыццяўляецца ў вёсцы Стрыгава Кобрынскага раёна на закрытым акцыянерным таварыстве «Экалогія-121» (сабрана і перапрацавана 76 тон), а таксама на базе Брэсцкага электралямпавага завода (сабрана і перапрацавана 59,32 тоны, з іх ад насельніцтва — 4,79 тоны).

***— Нядаўна былі агучаны лічбы, што пры патрэбнасці 330 тысяч тон макулатуры ў год у нас збіраецца толькі 260 тысяч тон, астатнюю даводзіцца імпартаваць. Як у вас у вобласці ідуць справы з атрыманнем другасных матэрыяльных рэсурсаў (ДМР)?***

— На Брэсцкім смеццеперапрацоўчым заводзе была мадэрнізавана лінія механічнага сартавання адходаў пры дапамозе дааснашчэння комплексам абсталявання аўтаматычнага сартавання. Дзякуючы гэтаму павялічыўся працэнт здабывання паперы і поліэтылену са змяшаных камунальных адходаў да 15—16 %. Сёлета паспяхова праходзіць эксперымент: адходы з Жабінкі і Брэсцкага раёна вывозяць на гэты завод. Мэта вельмі простая: каб больш ДМР паступала на перапрацоўку і менш — на палігоны.

Аднак ёсць і нявырашаныя пытанні. У прыватнасці, у вобласці не створаны неабходныя магутнасці для здабывання ДМР са складу камунальных адходаў. Толькі палова з тых, што паступаюць на палігоны змяшаных камунальных адходаў, праходзяць праз станцыі сартавання. Здабыча другасных матэрыяльных рэсурсаў са складу цвёрдых камунальных адходаў у цэлым па вобласці склала 20,59 працэнта.

Праблемным пытаннем па-ранейшаму з'яўляецца будаўніцтва новых палігонаў цвёрдых камунальных адходаў для захавання адходаў, якія ўтвараюцца ў Ганцавіцкім, Івацэвіцкім, Кобрынскім і Столінскім раёнах вобласці.

Нам ёсць куды расці: у пытаннях абыходжання з адходамі неабходна актывізаваць работу па павышэнні эфектыўнасці раздзельнага збору адходаў, мадэрнізацыі і стварэнні новых вытворчасцяў па іх перапрацоўцы і прыцягненні дадатковых інвестыцый на гэтыя мэты.

**Аксана ЯНОЎСКАЯ.**
**Фота аўтара.**

Крылаты свет

# Цуды ў пер'ях

## Ці ёсць у птушак малако, ці насамрэч крумкач — «муж» вароны?

**Пра самыя распаўсюджаныя домыслы, якія строяць людзі ў адносінах да птушак, расказаў спецыяліст па прыродаахоўных пытаннях грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны» арнітолаг Сямён ЛЕВЫ.**



Фота Мікалая ГУЛІНСКАГА.

**Совы дрэнна бачаць днём.**

— Днём гэтыя птушкі звычайна сядзяць у сховішчах, заплюшчыўшы ці прыжмурыўшы вочы, — кажа Сямён Левы. — І людзі думаюць, што яны не лётаюць, таму што не бачаць. На самай справе совы добра арыентуюцца і ўдзень. А свае яркія вочы прыплюшчваюць, каб іх не заўважылі іншыя драпежныя птушкі.

**Падабраная птушаняці не прымуць назад у гняздо з-за паху чалавека.** Нягледзячы на тое што птушкі сапраўды адчуваюць чалавечы пах, гэта іх не спалохае, і птушаня не кінуць — бацькоўскі інстынкт у іх дастаткова моцны.

**Каршуны цягаюць курэй.** На самай справе каршуны — даволі рэдкія на Беларусі птушкі, прытым яны не палююць на курэй. Гэтым займаюцца шуляк-галубятнікі (раней называліся ястрабамі-цецяроўнікамі).

— Калі шуляк панадзіўся цягаць курэй, можна абараніцца ад драпежніка сеткай, — параіў Сямён Левы. — Забіваць жа іх нельга, ды і бессэнсоўна: на месца адной птушкі прыляціць другая.

**Птушынае малако — гэта выдумка.** У птушак ёсць сакрэт (выдзяляецца ў валляку), падобны да тварожыстай масы, які і называюць птушыным малаком. Ім птушкі, асабліва прадстаўнікі атрада голубападобных, выкормліваюць сваё патомства. Але да аднайменных цукерак гэты сакрэт ніякага дачынення не мае.

**Усе чорныя птушкі ў горадзе — вароны.** Насамрэч вароны (як самцы, так і самкі) маюць чорна-шэрую афарбоўку. Часта ж збіраюцца ў чароды і шумяць у гарадах яшчэ адны прадстаўнікі крумкачовых — гракі. У прыродзе ёсць і чорныя вароны, але ў нас птушкі гэтага віду рэгіструюцца вельмі рэдка — іх арэал знаходзіцца на захадзе Еўропы.

**У дзятла бывае страсенне мазгоў.** За секунду дзяцел можа стукнуць дзюбай 22 разы, а за дзень зрабіць 12 тысяч удараў аб цвёрдую паверхню. Але гэта не шкодзіць здароўю птушак дзякуючы цэламу шэрагу прыстасаванняў, якія яны выпрацавалі за час эвалюцыі.

**Снягір — «зімовая» птушка.** Гэта меркаванне ўзнікла таму, што людзі не бачаць снегіроў у цёплы час. Але летам яны таксама знаходзяцца ў Беларусі: гнездавы перыяд і час кармлення птушанят птушкі праводзяць, як правіла, у яловых лясах. Зімой жа снегіры прылятаюць да чалавечых паселішчаў у пошуках больш даступнага корму.

**Вераніка КОЛАСАВА.**

У свеце жывёл

# «ЗУБР — ГЭТА ЛЯСНАЯ КАРОВА»

## ЯК ПРАЕКТ «ВЕТЛАНДС» ДАПАМАГАЕ ЗВЯРАМ І ЛЮДЗЯМ



**«А, вунь яны, прыгажуны!» — паказвае кудысьці на гарызонт Васіль ГУРКОЎ, дырэктар рэспубліканскага ландшафтнага заказніка «Налібоцкі». Праз тры хвіліны пад'язджаем бліжэй, і тры размытыя маленькія кропкі ператвараюцца ў дзясятак статных зуброў. Усяго некалькі крокаў аддзяляюць нас ад жывёл. Асноўная частка іх хутка разбягаецца, і толькі тры веліканы і адзін падлетак з цікаўнасцю і нейкім напружаннем глядзяць на нас некаторы час, быццам пазіруюць на камеру. Аднак не. Сапраўдныя матывы іх насцярожаных паводзін выдаюць маленькі капыток і вушка, што тырчаць з-за вялікай постаці. Як і ўсе бацькі, дарослыя зубры проста абаранялі свайго малыша.**

Пасля Васіль Гуркоў расказаў, што зубры ў Налібоцкай пушчы да чалавека ўжо даўно прывыклі. А некаторых егераў нават ведаюць у твар, напрыклад, з сенам могуць падпусціць вельмі блізка. Гучыць забаўна, але ўзнікае лагічнае пытанне: навошта дзікіх жывёл увогуле кормяць у заказніку, гэта ж не заапарк. Адказ трэба пачаць здалёку.

У канцы мінулага стагоддзя ў «Налібоцкім» была створана першая папуляцыя зуброў, якія жывуць на волі (дагэтуль рэдкіх жывёл трымалі тут у вальерах). І калі ў той перыяд іх колькасць беспярэпынна расла, то сёння паказчыкі нараджальнасці знізіліся да нуля. Справа ў тым, што яшчэ 20 гадоў таму Налібоцкая пушча выглядала па-іншаму — разам з лесам тут гарманічна суіснавалі і адкрытыя прасторы, дзе пасвілася свойская скаціна, нарыхтоўвалася сена, а таксама карміліся і дзікія жывёлы (у тым ліку і зубры). Аднак з цягам часу людзі пакінулі заказнік, а дзікія жывёлы самастойна расчышчаць сабе лугі не паспявалі, таму хутка апошнія зараслі хмызнякамі. Сваю ролю адыграла і меліярацыя, калі большая частка поймаў была ператворана ў каналы, якія, у сваю чаргу, засяліліся бабрамі.

— Зубр — гэта лясная карова, якой патрэбна трава. Прытым трава, што расце ў лесе ці побач з ім. Цяпер знайсці яе ў заказніку яны не могуць, таму і пачалі выходзіць на калгасныя палі, а гэта сур'ёзная праблема, — падкрэсліў **загадчык сектара міжнароднага супрацоўніцтва НПЦ па біярэсурсах НАН Беларусі Аляксандр КАЗУЛІН.**

Дапамагчы зубрам і людзям (якія пакутуюць ад нечаканых гасцей) павінен пяцігадовы праект «Ветландс», які фінансуецца Глабальным экалагічным фондам і рэалізуецца Праграмай развіцця ААН сумесна з Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.

Па словах спецыялістаў, адна з мэт — аднавіць мазаічнасць лесу, каб жывёлы не разбягаліся. І першыя вынікі ўжо ёсць. Так, на сямі лугавых тэрыторыях да снежня будзе выдалена ўся лішняя расліннасць, а гэта каля 146 га. А ў сакавіку тут пасеюць спецыяльныя сумесі траў, якія вельмі любяць зубры: цімафееўку, купкоўку, аўсяніцу і г. д. Тэхніка, што дапамагае пазбаўляцца ад хмызнякоў, і спецыяльныя сумесі былі закуплены ў рамках праекта. Увогуле за пяць гадоў плануецца расчысціць каля 500 га такіх угоддзяў. Таксама прадугледжаны падкормачныя пляцоўкі на зімовы перыяд з ячменем, соллю, галінамі і сенам.

Ёсць у праекта і больш маштабныя планы — генетычнае аздараўленне налібоцкай мікрапапуляцыі зубра. Для гэтага на аснове малекулярна-генетычных даследаванняў, магчыма, ужо ў наступным годзе, правядуць пашпартызацыю жывёл.

— Мы не думаем павялічваць колькасць налібоцкіх зуброў да небывалых памераў. Увогуле, іх павінна быць столькі, колькі пракорміць пушча, — сказаў Аляксандр Казулін. — У ідэале, вядома, мы хочам, каб усе беларускія мікрапапуляцыі, якіх зараз дзесяць, мелі магчымасць сустракацца.

**Кацярына ЦІТОВА.**
**Фота аўтара.**

## ДОПОЛНИТЕЛЬНОЕ ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 27 декабря 2018 года на 22-м открытом аукционе проводит 21-й от 15 ноября 2018 года и 14-й от 9 ноября 2017 года повторные открытые аукционы по продаже имущества республиканской собственности

| Номер лота | Наименование техники | Местонахождение объекта | Начальная цена продажи (бел. руб.) | Сумма задатка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 302 | Седельный тягач МАЗ-537 ш. 82095759 дв. К10КТ8604 1982 г. *4 кат. 9 764 км* | г. Старые Дороги в/ч 48668 | 12 000,00 | 2 400,00 |
| 137 | ПСГ-160(431410) скл. перекачивающая станция горючего с/о 163 на ЗиЛ-431410 ш. 3147922 дв. 832364 1991 г. *4 кат. 1284 км* | н. п. Михановичи в/ч 52188, | 7 000,00 | 1 400,00 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж **27 декабря 2018 г. в 10.30.** К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток, гарантийный депозит и подавшие заявление на участие в аукционе, соглашение, учредительные и другие необходимые документы до **15.00 21 декабря 2018 года**.

Заключительная регистрация участников аукциона будет производиться **27 декабря 2018 г. с 9.00 до 9.45.**

**Победитель аукциона обязан:**

1. Заключить договор купли-продажи не позднее 3 банковских дней с момента проведения аукциона.

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение **5** банковских дней для резидентов Республики Беларусь и **10** банковских дней для нерезидентов Республики Беларусь со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток, указанный в таблице, а также гарантийный депозит в размере 300,00 белорусских рублей и денежные средства за выигранное имущество перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: белорусские рубли – р/с BY31BLBB30120101099370001001 в ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, пр-т Машерова, 29, код BLBBBY2X, российские рубли – р/с BY05BPSB30121078830876430000 (RUR), в Центре банковских услуг № 701, ОАО»БПС-Сбербанк» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, код BPSBBY2X, УНН 101099370, ОКПО 37401662 Корреспондент-Сбербанк России г. Москва № корсчета 30111810100000000090. Реквизиты банка: БИК 044525225, ИНН 7707083893 к/с в ОПЕРУ Московского ГТУ Банка России № 30101810400000000225, УНП 101099370, БИК 153001369. **Без НДС**. **Справки по тел./факсу: (017) 398 05 41.** Ранее опубликованные извещения в газете «Звязда» № 192 от 5.10.18, № 167 от 31.08.17 г.

## Извещение о проведении торгов

Торги состоятся 28.12.2018 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Коммунистическая, 11, к. 218.

Организатор торгов: Унитарное предприятие «Минское отделение БелТПП, 220113, г. Минск, ул. Якуба Коласа, д. 65, к. 3, тел. +375172895680. Сайт www.tppm.by.

Продавец имущества – ОАО «БАТЭ» – управляющая компания холдинга «Автокомпоненты».

Заявления на участие в торгах принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.30 до 13.00 и с 13.45 до 17.30, в пятницу до 16.15 по адресу: г. Минск, ул. Коммунистическая, 11, к. 203. Последний день приема заявлений на участие в торгах с прилагаемыми к ним документами – 27.12.2018 до 13.00. Заключительная регистрация участников торгов 28.12.2018 с 8.30 до 11.00. С объектами можно ознакомиться ежедневно в рабочие дни до установленного последнего дня подачи заявлений на участие в торгах. Местонахождение Объекта – ОАО «БАТЭ» – управляющая компания холдинга «Автокомпоненты» г. Борисов Минской области, ул. Даумана, 95.

| № п/п | Наименование | Год выпуска | Номер кузова | Инв. номер | Начальная цена отчуждения на аукционе, без НДС (бел. руб.) | Сумма задатка, без НДС (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Легковой джип Volkswagen Tiguan | 2011 | WVGZZZ5NZBW12003 | 14522528 | 13 342,55 | 1334,26 |
| 2 | Автобус Volkswagen Crafter Pavlio | 2008 | WV1ZZZ2EZ96011464 | 14526947 | 23 542,55 | 2354,26 |

Сумма задатка – 10 % от начальной цены предмета аукциона без НДС (по каждому лоту).

Задаток перечисляется на расчетный счет унитарного предприятия «Минское отделение БелТПП», УНП100144204. Расчетный счет: (IBAN) BY28 BELB 3012 1064 5100 3022 6000 ОАО «Банк БелВЭБ», код банка (BIC) BELBBY2X Адрес банка: г. Минск, пр-т Победителей, 29.

Шаг аукциона: 10 %. Первая объявленная цена определяется в соответствии с шагом аукциона к начальной цене продажи предмета торгов. Победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену приобретения лота по сравнению с предложениями других лиц.

Условия продажи. Срок подписания договора купли-продажи: в течение 7 (семи) календарных дней с даты проведения аукциона. Условия оплаты: 100 % предоплата. Погрузка и транспортировка предмета аукциона, соблюдение таможенных процедур и формальностей производятся за счет покупателя. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия.

Для участия в торгах в указанный в извещении срок в унитарное предприятие «Минское отделение БелТПП» подается заявление на участие в торгах с необходимыми документами, указанными на сайте организатора торгов: www.tppm.by.

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Мозырьагропромснаб» (продавец) извещает о проведении 12 декабря 2018 года открытого повторного аукциона по продаже имущества со снижением на 20 % в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел.руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | **Капитальное строение с инв. № 330/С-25115**, назначение – сооружение специализированное транспорта, наименование – **стоянка (инв. № 217) общей площадью 0,0 кв. м,** 2000 г.п. **Составные части:** площадка асфальтобетонная площадью **2 986,0 кв. м**, газон травяной площадью **2 376,0 кв. м**, дорожка бетонная площадью **11,2 м**, ограждение ж/б протяженностью **160,9 м**, ограждение металлическое протяженностью **124,3 м**, туалет площадью **2,5 кв. м**, эстакада материал – металл. Информация о земельном участке: кадастровый номер **323500000001000006** общей площадью **0,5389 га (право аренды).** Местонахождение: **Гомельская область, Мозырский р-н, Р-31, 161-й км** | **38 440,00** | 3 844,00 |

**Продавец:** ОАО «Мозырьагропромснаб», Гомельская область, Мозырский район, д. Козенки, ул. Спортивная 77А. Контактный тел. 8 (0236) 23-25-26 – Древило Аксана Михайловна. **Шаг аукционных торгов – 5 %. Для участия в аукционе необходимо:** 1. Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «Мозырьагропромснаб»):** р/с BY28 SLAN 3012 1124 3001 9000 0000 в ЗАО «Банк ВТБ» (Беларусь) г. Минск РД № 100 г. Мозырь, код банка SLANBY22, УНП 490803594, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № 1. 2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно с 27 ноября 2018 г. по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 10 декабря 2018 г. в 16.00. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются.**

**Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения.** В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) %. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается Продавцом торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договора купли-продажи в течение **15 (пятнадцати) рабочих дней** и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). **Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 19.10.2018 г. № 202 (28818). Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы». Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54 (тел./факс), 23-23-56, 8(029)126-66-62.**

**ООО «Центр Белинвентаризация»**
***г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1***

- ✓ **Раздел и установление порядка пользования земельным участком**
- ✓ **Раздел и вычленение изолированных помещений из капитального строения**
- ✓ **Пересчет долей в связи с изменением капитального строения**

## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ИМУЩЕСТВА ОАО НТК «АЛЕСЯ», тел. 8 (0232) 29 51 13

| № лота | Наименование объекта | Начальная стоимость лота, бел. руб. с НДС | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | Изолированное помещение (торговое) площадью 31,8 кв. м, расположенное по адресу: г. Гомель, ул. Белого, 52а. Цель использования: для оказания услуг, для организации торговли непродовольственными товарами. Срок договора аренды 3 года, арендная плата в месяц 753,08 руб. с учетом НДС 20 % | **188,27 руб.** | **37,65 руб.** |

| | |
|---|---|
| Срок подачи заявления | **По 26 декабря 2018 г**. в рабочие дни с 9.00 до 16.00 от даты опубликования настоящего извещения по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1 |
| Дата, время и место проведения аукциона | **28 декабря 2018 г. в 11.00** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1 |
| Номер р/с для перечисления задатка | Р/с BY71BPSB30121783390109330000 в РД № 300 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 491323266. Получатель платежа: ООО «Центр Белинвентаризация». Назначение платежа: задаток на участие в аукционе согласно извещению в газете «Звязда» от 27.11.2018 г. |
| Условия продажи | Шаг аукционных торгов – 10 %. Заключить договор аренды в течение 10 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Победитель возмещает затраты на организацию и проведение аукциона |

**Для участия в аукционе необходимо предоставить:**
1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение о правах и обязанностях с ООО «Центр Белинвентаризация».
2. Заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет организатора торгов.
3. Юридическим лицам – резидентам Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего регистрацию юридического лица; представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
4. Юридическим лицам – нерезидентам Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе); представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
5. Индивидуальным предпринимателям – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; представителю индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
6. Физическим лицам – представителю физического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.
7. При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.
8. Участник аукциона, выигравший торги, либо лицо, признанное покупателем, оплачивает стоимость затрат на организацию и проведение аукционных торгов – Организатору аукционных торгов.
9. Аукцион проводится в соответствии с действующим законодательством и Положением ООО «Центр Белинвентаризация»

**Дополнительная информация на сайте www.bti-gomel.by, по тел. (0232) 75 06 62, (029) 341 15 45**

Центр Промышленной Оценки
- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

**Извещение о проведении аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | Воложинское районное потребительское общество, Минская обл., г. Воложин, ул. Партизанская, 30 |

**Предмет аукциона**
**Месторасположение: Минская обл., Воложинский р-н, г. Воложин, ул. Советская, 85**

| Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер |
|---|---|---|---|
| **Здание магазина №№ 68–69 «Мебель – хозтовары»** | Здание специализированное розничной торговли | 816,5 кв. м | 632/С-2098 |

Составные части и принадлежности: терраса, блочное хозпомещение, кирпичная рампа

**Сведения о земельном участке:** общ. пл. **0,2203** га, предоставлен на праве постоянного пользования для размещения объектов розничной торговли. Ограничения (обременения) прав: водоохранная зона водных объектов

**Обременение:** площади здания сданы в аренду. Более подробную информацию по арендаторам можно узнать у организатора аукциона

**Начальная цена с НДС 20 % – 230 000,00 бел. руб.**

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок заключения договора купли-продажи** | **15** рабочих дней после снятия продавцом зарегистрированных обременений по предмету аукциона в установленном законодательством Республики Беларусь порядке |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**Аукцион состоится 11.01.2019** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и необходимые **документы принимаются по 09.01.2019 до 17.00** по указанному адресу. Тел.: +375 17 280-36-37; 8 029 317-95-42. www.cpo.by. Email: auction@cpo.by

Центр Промышленной Оценки
- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

**Извещение о проведении повторного аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ООО «Завод автомобильных прицепов и кузовов «МАЗ-Купава», г. Минск, ул. Машиностроителей, д. 18 |

**Предмет аукциона (имущество реализуется одним лотом).**
**Месторасположение: Минская обл., Червенский р-н, Смиловичский с/с, д. Старино**

**Цех деревообработки с административными помещениями** (615/С-35497, 1027,1 кв. м), в т. ч. вент. камеры 2 шт., рампа 2 шт., сети питьев. водопровода 184,7 м; сети быт. (255,7 м) и ливн. (287,4 м) канализации; очистные сооружения; двухкамер. септик; поля фильтрации 235 м; покрытия 6446 кв. м.
**Склад** (615/С-35853, 150,6 кв. м), в т. ч. пристройка.
**КПП** (615/С-35856, 7,6 кв. м), в т. ч. ограждение 639,7 м.
**ТП** (615/С-245, 68,3 кв. м).
**Водозаборная скважина** 615/С-35855), в т. ч. насос Grundfos.
**Насосная станция** (615/С-35496, 25,2 кв. м), в т. ч. 2 резервуара 150 куб. м; сети пожар. водопровода 484,3 м.
**Иное имущество:** сети электроснабжения и оборудование (в соответствии с перечнем, размещенным на сайте организатора аукциона www.cpo.by)

**Сведения о земельном участке**: пл. **2,5727 га,** предоставлен на праве аренды по 20.11.2115 для обслуживания цеха деревообработки с административно-быт. помещениями, зданий и сооружений. Ограничения – находится в охран. зонах электрич. сетей свыше 1000 В, пл. 0,2 га

**Начальная цена с НДС – 390 386 руб. 07 коп.** (снижена на 50 %)

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 15** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона:** 60 % от цены продажи имущества, с учетом ранее внесенной суммы задатка оплачиваются в течение 10 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи, оставшаяся сумма оплачивается с рассрочкой платежа на срок до 6 месяцев

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в **газете «Звязда» от 11.10.2018**

**Аукцион состоится 21.12.2018 в 14.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и необходимые **документы принимаются по 20.12.2018 до 17.00** по указанному адресу. Тел.: +375 17 280-36-37; 8 029 317-95-42. **www.cpo.by**

## Антикризисный управляющий ЧП «Правовая компания «БелПофКонсалт» объявляет о проведении открытых торгов в форме аукциона по продаже имущества ООО «Гольф Клуб» (дата торгов 27.12.2018 г.)

**Срок приема заявок – с 26.11.2018 по 26.12.2018 г.**

Лот № 1. Комплекс имущества для обслуживания гольф-полей стоимостью 230 037,60 бел. руб. (с НДС).

Место проведения торгов: г. Минск, пр-т Победителей, 127, оф. 312.

Подробная информация о дате, времени и порядке проведения торгов, предлагаемых к продаже лотах, начальной цене и размере задатков, продавце и организаторе, иная информация, требуемая в соответствии с законодательством, размещена в ЕГР сведений о банкротстве http://bankrot.gov.by

УНП 191875692

**В связи с реструктуризацией ЗАО «ПАРАД» с 31 декабря 2018 года закрывается Филиал № 1 ЗАО «Парад».** Производство и выпуск продукции, а также все иные финансовые обязательства переходят к юридическому лицу – закрытому акционерному обществу «ПАРАД».

УНП 100926738

Да 75-годдзя ВЫЗВАЛЕННЯ 1944 2019

# КАМБРЫГ ФЁДАР ПАЎЛОЎСКІ

## Ён быў адным з першых савецкіх партызан, уганараваных Залатой Зоркай Героя

**Ідучы насустрач 75-годдзю з дня вызвалення Беларусі ад нямецкіх акупантаў, мы ўспамінаем воінаў Чырвонай Арміі і партызанаў, якія прынялі самы актыўны ўдзел у гэтым вызваленні. Наш аповед пра партызанскага камандзіра Фёдара Паўлоўскага, якому якраз сёння споўнілася б 110 гадоў.**



### Як камандзір камісарам стаў

Адным з першых партызанскіх атрадаў на тэрыторыі Беларусі быў атрад «Чырвоны Кастрычнік» Акцябрскага раёна, створаны 26 чэрвеня 1941 года (па іншых звестках, у пачатку ліпеня 1941 года) упаўнаважаным Наркамата нарыхтовак СССР па Акцябрскім раёне Палескай вобласці Фёдарам Паўлоўскім разам з першым сакратаром Акцябрскага райкама партыі Ціханам Бумажковым. Калі паўстала пытанне аб кандыдатуры камандзіра атрада, першы сакратар Палескага абкама партыі Пётр Лявіцкі звярнуў увагу на анкету Паўлоўскага. Фёдар Іларыёнавіч быў вопытным ваенным, скончыў палкавую кавалерыйскую школу, удзельнічаў у баях з японцамі каля возера Хасан у 1938 годзе, у савецка-фінляндскай вайне 1939—1940 гадоў. Таму па ўзгадненні з абкамам партыі камандзірам атрада быў зацверджаны Фёдар Паўлоўскі, а камісарам — Ціхан Бумажкоў.

Але калі ў ліпені 1941 года ЦК Кампартыі Беларусі прадставіў іх у Маскву да ўзнагароджання ганаровым званнем Героя Савецкага Саюза, першы сакратар ЦК КП(б)Б Панцеляймон Панамарэнка палічыў, што камандзірам атрада павінен быць партыйны лідар Акцябрскага раёна Ціхан Бумажкоў. ЦК фактычна памяняў іх пасадамі, каб паказаць вядучую ролю кампартыі ў развіцці партызанскага руху. Таму ў многіх энцыклапедыях і даведніках дагэтуль можна сустрэць прозвішча Бумажкова, як першага камандзіра атрада «Чырвоны Кастрычнік». Аб гэтым мне ўпершыню паведаміў мой зямляк — вядомы беларускі паэт і празаік Рыгор Няхай, які даследаваў гісторыю гэтага атрада і 123-й партызанскай брыгады і быў добра знаёмы з Фёдарам Паўлоўскім.

### Першыя Героі

Безумоўна, адной з самых паспяховых аперацый беларускіх партызан у гады Вялікай Айчыннай вайны стаў Воземлянскі бой 1941 года. Гэта быў бой паміж партызанскім атрадам «Чырвоны Кастрычнік» сумесна з падраздзяленнем Чырвонай Арміі (камандзір — падпалкоўнік Л. В. Курмышоў) і нямецкімі акупантамі ў вёсцы Воземля Акцябрскага раёна Палескай вобласці 18 ліпеня 1941 года.

Напярэдадні партызанская разведчыкі ўстанавілі сілы воінскай часці вермахта і дакладнае размяшчэнне яе агнявых сродкаў. 18 ліпеня 1941 года па чыгуначнай ветцы Бабруйск — Рабкор браняпоезд № 52 на чале з лейтэнантам Калакольцавым нечакана для нацыстаў падышоў да вёскі Воземля і адкрыў артылерыйскі агонь па штабе нямецкай дывізіі і агнявых пунктах праціўніка. Пасля артылерыйскага абстрэлу зводны атрад чырвонаармейцаў і партызанаў пад кіраўніцтвам інструктара райкама партыі Сямёна Маханько атакаваў нямецкіх салдат і афіцэраў. У выніку боя нацысты страцілі забітымі і раненымі каля 80 салдат і афіцэраў, была вызвалена вёска Воземля. Партызаны захапілі палонных і ў якасці трафеяў 55 броне- і аўтамашын, 2 радыёстанцыі, 27 матацыклаў, 45 коней з павозкамі і грузам, аперацыйныя дакументы нямецкага штаба. Захопленых салдат і афіцэраў вермахта, дакументы і трафеі камандаванне партызанскага атрада «Чырвоны Кастрычнік» перадало камандаванню 63-га стралковага корпуса Чырвонай Арміі. Сярод штабных дакументаў знаходзілася аперацыйная карта з планам наступлення нямецкіх войскаў на Гомель і Чарнігаў.

Характарызуючы наступныя баявыя дзеянні партызанскага атрада «Чырвоны Кастрычнік», начальнік Беларускага штаба партызанскага руху Пётр Калінін у сваіх мемуарах «Партызанская рэспубліка» адзначаў:

«Асабліва смелай для таго перыяду вайны была аперацыя па разгроме войскаў нямецкага злучэння ў сяле Глуша Бабруйскага раёна. Партызаны правялі яе сумесна з вайсковай часцю. Кіраваў аперацыяй капітан А. А. Недагораў, партызанскую групу ўзначальваў Паўлоўскі Ф. І.

Паўлоўскі загадзя паслаў у сяло некалькі чалавек для арганізацыі засады. Яшчэ завідна партызаны пад выглядам мясцовых сялян прабраліся ў Глушу. Калі сцямнела, яны першымі адкрылі з засады агонь па нямецкіх вартавых. У вокны школы, дзе начавалі гітлераўцы, паляцелі гранаты. Гэта быў сігнал да агульнай атакі. Амаль адначасова ў сяло ўрываліся з аднаго боку чырвонаармейцы, а з другога — партызаны на чале з Паўлоўскім.

Бой працягваўся каля гадзіны. Варожыя афіцэры і салдаты, напаўголыя, выскоквалі з дамоў і тут жа пападалі пад трапны агонь. Толькі некаторым з іх удалося выратавацца ўцёкамі. Астатнія былі знішчаны».

У гэтым начным баі чырвонаармейцы і партызаны захапілі 35 штабных аўтамашын, каля 100 матацыклаў і веласіпедаў, шмат дакументаў і аперацыйных картаў.

Не забудзем, што ішоў толькі ліпень 1941 года, што гэта адбылося амаль у самым пачатку партызанскага руху на Беларусі.

За ўмелае кіраўніцтва партызанскім атрадам «Чырвоны Кастрычнік» і праяўленыя пры гэтым мужнасць і гераізм Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 6 жніўня 1941 года Ц. П. Бумажкову і Ф. І. Паўлоўскаму было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Яны сталі першымі савецкімі партызанамі, якія атрымалі гэта высокае званне.

### Яго гарнізон...

У канцы верасня 1941 года партызанскі атрад «Чырвоны Кастрычнік» вызваліў ад нямецкіх акупантаў многія населеныя пункты ў Акцябрскім, Воземлянскім, Гацкім, Новадуброўскім, Гарохавіцкім, Ляскавіцкім, Парэцкім, Пратасаўскім, Ламавіцкім, Раманіцкім і іншых сельсаветах. Тым самым быў пакладзены пачатак стварэнню Акцябрскай партызанскай зоны з цэнтрам у пасёлку Рудобелка. Да канца 1941 года ўсе вёскі раёна былі вызвалены ад нямецкіх акупантаў.

Аб'яднаўшыся для сумесных дзеянняў, атрады Паўлоўскага і Далідовіча 14 студзеня 1942 года ліквідавалі варожы гарнізон у вёсцы Ветчын Жыткавіцкага раёна, а праз тры дні вызвалілі ад нямецкіх акупантаў мястэчка Капаткевічы. Мала каму вядома, што менавіта Капаткевічы сталі першым раённым цэнтрам, вызваленым беларускімі партызанамі ў 1942 годзе.

У студзені 1942 года ў Палескай вобласці дзейнічалі 14 партызанскіх атрадаў. У ходзе сумесных баёў па абароне Акцябрскай партызанскай зоны ў канцы студзеня 1942 года на нарадзе камандная складу атрадаў, якія дзейнічалі ў Акцябрскім, Капаткевіцкім, Глускім, Петрыкаўскім, Жыткавіцкім раёнах, было вырашана аб'яднаць згаданыя баявыя адзінкі ў адно партызанскае злучэнне. Гэта фарміраванне партызан атрымала назву «гарнізон Паўлоўскага», або Палескае партызанскае злучэнне.

За час працяглага рэйду атрады «гарнізона Паўлоўскага» змаглі ачысціць ад акупантаў амаль усю тэрыторыю Акцябрскага, Глускага, Капаткевіцкага, Дамановіцкага і Парыцкага раёнаў. Такім чынам, існаваўшая партызанская зона значна пашырылася. А яе цэнтрам, як і раней, заставалася Рудобелка.

У атэстацыйным лісце на прысваенне Фёдару Іларыёнавічу чарговага воінскага звання ўказана наступнае:

«Пад камандаваннем т. Паўлоўскага ў студзені 1942 г. у Палескай вобласці разгромлена нямецкая дывізія СС (хутчэй тут трэба разумець нейкія часці гэтай дывізіі. — **Э. І.**), а таксама пушчана пад адхон два эшалоны праціўніка, 14 паравозаў і 444 вагоны, разгромлена 5 нямецкіх гарнізонаў, у якіх знішчана 2430 салдат і афіцэраў, а таксама шмат паліцаяў і здраднікаў».

У чым сакрэт поспеху «гарнізона Паўлоўскага»? Менавіта аб'яднанне разрозненых атрадаў у Акцябрскай зоне і стварэнне агульнага кіраўніцтва імі дазволілі значна актывізаваць баявую дзейнасць партызанаў, умацніць палітычную работу сярод насельніцтва, агульнымі намаганнямі процістаяць карным экспедыцыям акупантаў.

У далейшым многія камандзіры і камісары «гарнізона» праявілі сябе здольнымі арганізатарамі, набылі ўпэўненасць камандаваць самастойна, і частка іх пакінула «гарнізон Паўлоўскага».

### ...і яго брыгада

У маі 1942 года з атрадаў, якія ўваходзілі ў склад «гарнізона Паўлоўскага», была створана 123-я партызанская брыгада пад камандаваннем Фёдара Паўлоўскага. Да лютага 1943 года брыгада называлася па прозвішчы камандзіра, затым — 123-я, а з 1 студзеня 1944 года — 123-я Акцябрская імя 25-годдзя БССР. У сакавіку 1943 года атрады І. С. Губіна і А. Ф. Сарафанава былі перададны для арганізацыі 210-й Капаткевіцкай брыгады.

123-я брыгада дзейнічала ў Акцябрскім, Капаткевіцкім, Глускім, Петрыкаўскім, Жыткавіцкім, Парыцкім раёнах. Фёдар Іларыёнавіч Паўлоўскі камандаваў ёй у маі 1942-га — красавіку 1943-га, кастрычніку 1943-га — маі 1944 года. Калі ў красавіку 1943 года яго адклікалі ў Маскву, то часова (красавік — кастрычнік 1943 года) абавязкі камбрыга-123 выконваў Сямён Васілевіч Маханько.

Аналіз фондаў Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь сведчыць, што 123-я партызанская брыгада была адной з самых баздольных брыгад Палескай і Мінскай абласцей. Спачатку яна ўваходзіла ў склад партызанскага злучэння Мінскай і Палескай абласцей, а з 15 сакавіка 1943 года — злучэння Палескай вобласці.

У лістападзе 1942 года партызаны 123-й брыгады ўдзельнічалі ў аперацыі «Рэха на Палессі» — падрыве моста цераз раку Пціч даўжынёй больш за 150 метраў з чатырма пралётамі (рух на чыгуначным участку Жыткавічы — Калінкавічы быў спынены на 18 сутак).

Да канца студзеня 1944 года партызаны ўтрымлівалі Рудобелку, дзе дзейнічалі савецкія ўстановы і школы. Толькі на чыгуначным участку Карпілаўка — Ратміравічы атрады 123-й брыгады ў жніўні і верасні 1943 года разбурылі 20 кіламетраў чыгуначнага палатна, знішчылі 7 мастоў, а 7 лістапада правялі паспяховы бой з аб'яднанай варожай групоўкай (8 гарнізонаў) і выйшлі з акружэння, выбілі акупантаў з вёскі Гаць.

### Рудабельскія «вароты»

Калі восенню 1943 года пачалося вызваленне Беларусі, Фёдар Паўлоўскі ўдзяліў асаблівую ўвагу ўзаемадзеянню з наступаючымі часцямі Чырвонай Арміі. Не ўсім вядома, што ў канцы лістапада 1943 года ў выніку Гомельска-Рэчыцкай наступальнай аперацыі і дзейнняў 123-й партызанскай брыгады пад камандаваннем Паўлоўскага ў лініі фронту групы армій «Цэнтр» утварыўся разрыў шырынёй каля 10 кіламетраў, які ўвайшоў у гісторыю як Рудабельскія «вароты». Часці Чырвонай Арміі і партызаны ўтрымлівалі іх каля месяца.

У лістападзе — снежні 1943 года народныя мсціўцы гэтай брыгады падарвалі 10 танкаў, 35 аўтамашын, спалілі 14 мастоў, пашкодзілі 6 кіламетраў тэлефонна-тэлеграфнай лініі. У лістападзе 1943 года яны цераз лінію фронту ўстанавілі сувязь з 37-й і 60-й стралковымі дывізіямі Чырвонай Арміі, перадавалі ім звесткі разведкі, забяспечвалі праваднікамі. Брыгада Паўлоўскага дапамагала дзеючай арміі ў вызваленні Капаткевічаў і Калінкавічаў.

* * *

З ліпеня 1944 года Фёдар Паўлоўскі знаходзіўся ў запасе. У 1945—1966 гадах ён быў на кіруючай рабоце, галоўным чынам партыйнай і гаспадарчай.

Фёдар Іларыёнавіч быў узнагароджаны ордэнамі Леніна, Кастрычніцкай рэвалюцыі, Айчыннай вайны 1-й ступені, Чырвонай Зоркі, многімі медалямі.

Палкоўніка Паўлоўскага не стала 6 красавіка 1989 года — на 81-м годзе жыцця. Ён пахаваны ў родным гарадскім пасёлку Міхайлаўскі Запарожскай вобласці (Украіна).

Беларускі народ захоўвае ўдзячную памяць аб партызанах 123-й брыгады і яе камандзіру — адным з вызваліцеляў Беларусі ад нямецкіх акупантаў. У гонар гэтай брыгады ў 1948 годзе ў вёсцы Курын Акцябрскага раёна пастаўлены помнік, а ў 1959 годзе ў г. п. Акцябрскі ўстаноўлена мемарыяльная дошка.

У Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны захоўваюцца літаграфія мастака С. Раманава «Бой на рубяжы р. Пціч. Ліпень 1941 г.», кавалерыйская шашка і аўтамат Фёдара Паўлоўскага.

Імем Паўлоўскага названа вуліца ў Мінску ў Заводскім раёне. На доме № 1 у 2000 годзе ўстаноўлена мемарыяльная дошка.

Мінская школа № 31 носіць імя Героя Савецкага Саюза Ф. І. Паўлоўскага.

**Камандзірам атрада быў зацверджаны Фёдар Паўлоўскі, а камісарам — Ціхан Бумажкоў. Але калі ў ліпені 1941 года ЦК Кампартыі Беларусі прадставіў іх у Маскву да ўзнагароджання ганаровым званнем Героя Савецкага Саюза, першы сакратар ЦК КП(б)Б Панцеляймон Панамарэнка палічыў, што камандзірам атрада павінен быць партыйны лідар Акцябрскага раёна Ціхан Бумажкоў. ЦК фактычна памяняў іх пасадамі, каб паказаць вядучую ролю кампартыі ў развіцці партызанскага руху.**

**Эмануіл ІОФЕ, прафесар БДПУ імя М. Танка, доктар гістарычных навук.**

## Анастасія САРОКІНА:

# «Займаюся тым, што ўмею»

### Чаму яна гуляла за Аўстралію, трэніравала мясцовых дзяцей, жыла ў Тайландзе, а прыехала развіваць спорт у Беларусь

**Сёння наша краіна актыўна прасоўваецца ў шахматным свеце. Нядаўна стала вядома, што Сусветная шахматная алімпіяда ў 2022 годзе пройдзе ў Мінску, а месца аднаго з віцэ-прэзідэнтаў Міжнароднай федэрацыі гэтага віду спорту заняла беларуска Анастасія САРОКІНА. Усе гэтыя значныя падзеі адбыліся з прыходам Анастасіі на пасаду старшыні Беларускай федэрацыі шахмат, кіраваць ёю Сарокіна стала ўсяго паўтара года таму. У вялікім інтэрв'ю нашай газеце пляменніца вядомага шахматыста Віктара Купрэйчыка расказала пра ўрокі ад знакамітага дзядзькі, пра тое, як яна дамагаецца сваіх мэт, і ўспомніла няпростае жыццё на іншым кантыненце.**

***

***— Анастасія, вы займаеце адразу некалькі буйных пасад. Раскажыце трохі пра кожную з іх.***

— Пачну з нашай федэрацыі. Я ўзначальваю яе на працягу паўтара года, у нас выдатная каманда і папячыцельскі савет, таму за гэты невялікі час ужо шмат зроблена. Прыемна, што да нашага віду спорту, нягледзячы на тое, што ён не алімпійскі, такая ўвага з боку дзяржаўных структур і Міністэрства спорту і турызму. Дапамагаюць нам Нацыянальны алімпійскі камітэт і Прэзідэнцкі спартыўны клуб. Разам мы выйгралі права прыняць Сусветную шахматную алімпіяду 2022 года, жаночы і мужчынскі Кубкі свету ў 2020 і 2021 гадах адпаведна. На працягу трох гадоў мы праводзім чэмпіянат свету па бліцы і хутких шахматах сярод кадэтаў. Працы шмат, камандзіровак таксама. Адзіны мінус — вельмі мала бачу сваё дзіця, а так сваю працу вельмі люблю і аддаюся ёй цалкам.

***— Зараз дадаліся абавязкі віцэ-прэзідэнта ФІДЭ...***

— На прэзідэнцкім савеце, які прайшоў у Лондане ў пачатку лістапада, былі размеркаваны абавязкі ўсіх віцэ-прэзідэнтаў, мне дасталася тэма, з якой я дастаткова добра знаёмая, — гэта трэнерская камісія, якая займаецца ліцэнзаваннем трэнераў, ФІДЭ-акадэміі. Дарэчы, такая акадэмія ёсць і ў нас у Мінску, на працягу пяці гадоў я з'яўляюся яе дырэктарам. Школа шахмат ФІДЭ ў Беларусі ўжо на вельмі добрым рахунку, і мне вельмі хочацца спадзявацца, што ў далейшым яна стане найлепшай у свеце.

***— Якія бонусы ваша пасада можа прынесці Беларусі?***

— Па-першае, важна, што ў кіруючым складзе ФІДЭ пры арганізацыі алімпіяды ў Мінску будзе прадстаўнік Беларусі. Па-другое, мы пастараемся ўдасканаліць сістэму акадэмій ФІДЭ і прыцягнуць трэнераў у Беларусь. Тым больш што пакуль з трэнерамі ў нас ёсць праблемы. На шчасце, у БДУФК ужо некалькі гадоў рыхтуюць студэнтаў па спецыялізацыі шахмат, і я бачу па маладых шахматыстах, якія заканчваюць прафесійную кар'еру, што яны зацікаўленыя ў тым, каб працягваць сваю працу як трэнеры ці суддзі. Мы спадзяемся, што да алімпіяды падыдзем з добрымі спартсменамі і трэнерамі. А суддзяў штогод практыкуем на чэмпіянаце, які праходзіць у нас сярод кадэтаў. Гэта вельмі добры вопыт.

***— Ці зможаце вы працягнуць сваю судзейскую дзейнасць?***

— Так, яна будзе працягвацца, але ў меншай ступені. Сёлета, напрыклад, я судзіла ўсяго адзін матч на першынстве свету сярод жанчын. Графік вельмі шчыльны, а пры падрыхтоўцы да алімпіяды працы будзе ўсё больш і больш. Хоць я, вядома, не хацела б развітвацца з работай суддзі, для мяне гэта цікава, я даволі доўга ішла да таго, каб стаць топавым арбітрам.

***— Трэнерскую дзейнасць вы пакінулі?***

— Так, таму што трэнерская праца патрабуе пастаянных стасункаў з дзецьмі, гэта несумленна ў адносінах да іх, калі ты праводзіш некалькі трэніровак, а потым з'язджаеш. У маім выпадку, думаю, могуць быць толькі нейкія майстар-класы, але, калі шчыра, нават на іх пакуль часу няма.

***— Якая з усіх вашых пасад самая важная і складаная?***

— Вядома, для мяне галоўнае — развіццё шахмат у маёй краіне, званне старшыні федэрацыі шахмат у Беларусі нясу з гонарам і хачу, як мага больш дзетак у нашай краіне гулялі ў шахматы, каб яны развіваліся, каб шахматы былі паўсюль. Мне здаецца, што сумесныя намаганнямі гэта атрымліваецца. Што да самага складанага, не магу сказаць, што нейкая пасада больш ці менш складаная, таму што я займаюся тым, што ўмею і ведаю з пяці гадоў. Усё маё жыццё — гэта шахматы, нават калі ў нейкі перыяд я спрабавала цалкам адысці і займацца іншай прафесіяй — нічога з гэтага не выйшла, шахматы вярнулі мяне назад. Веру, што раблю нешта важнае не толькі для сябе, але і для ўсёй краіны. Шахматы — гэта інтэлектуальная будучыня нацыі, яны дапамогуць вырасціць больш паспяховых людзей.

***

***— Усім вядома, што ваш дзядзька — знакаміты шахматыст Віктар Купрэйчык. Якую галоўную параду ён даў вам у жыцці?***

— Ён падаваў прыклад не толькі мне, але і многім іншым людзям у плане сваёй прыстойнасці, сумленнасці, стаўлення да жыцця. Але ён ніколі не падтрымліваў маё жаданне быць прафесійнай шахматысткай, аднак заўсёды ставіўся з павагай да майго выбару. На жаль, у мінулым годзе дзядзька пайшоў з жыцця, цяпер бы, думаю, ён вельмі радаваўся навіне пра тое, што ў нас пройдзе алімпіяда.

***— Першыя вашы поспехі ён застаў?***

— Так, я ўжо не гуляла, а займалася каляшахматнай дзейнасцю. У нас заўсёды было шмат агульных тэм, мы гаварылі «на адной мове», і я думаю, ён радаваўся маім поспехам.

***— Наколькі складана сумяшчаць такую актыўную прафесійную дзейнасць з жыццём жанчыны, маці?***

— Шахматы займаюць самую вялікую нішу ў маім жыцці, я перажываю, што дачка расце без належнай маёй увагі. Вядома, увесь вольны час, нават мінімальны, я імкнуся праводзіць з ёй. Не магу сказаць, што праца перашкаджае мне быць жанчынай. Так, я заўсёды маю сваё меркаванне, імкнуся яго адстойваць, але і заўсёды рада прызнаць сваю памылку, калі я дзесьці не маю рацыі. І дарэчы, у такія моманты добра быць жанчынай. Што датычыцца звычайных слабасцяў, дазваляю іх сабе безумоўна, няхай гэта позна і рэдка. Па крамах прабегчы, у салон схадзіць, з дзяўчатамі сустрэцца, пасмяяцца і паплакаць люблю, як любая звычайная жанчына.

***

***— У досыць маладым узросце вы вырашылі з'ехаць у Аўстралію...***

— Усім расказваю казачную гісторыю, але гэта праўда. Дзядзька Віця аднойчы прывёз мне з Аўстраліі маленькага плюшавага мішку-каалу, на першым для мяне чэмпіянаце свету ў Дуйсбургу медзведзяня было маім талісманам — сядзела каля дошкі. Па дарозе ў гатэль я яго страціла, гэта была трагедыя, плакала ўсю ноч. Таму дзесьці з дзяцінства ў мяне была мэта знайсці такога ж каалу ў Аўстраліі.

На працягу года я вяла перапіску з адной са школ у Аўстраліі, потым доўга афармлялі візу. На той момант я працавала ў Міністэрстве спорту і турызму, таму былі абавязацельствы па заканчэнні кантракта. Пераезд нельга назваць спантанным.

***— Мэтай была менавіта Аўстралія?***

— Так, толькі гэтая краіна. Хоць на той момант мне прапанавалі дастаткова добры трэнерскі кантракт у Катары. Там былі ўмовы нашмат лепшыя і з фінансавага пункту гледжання, і з пункту гледжання кар'ернага росту. А ў Аўстраліі ўсё было вельмі незразумела, не было нават гарантавана, колькі гадзін я буду працаваць. Але я настолькі з дзяцінства хацела знайсці мішку... Там я яго купіла, і доўгія гады мы дарылі падобныя цацкі вучням нашай Школы шахмат ФІДЭ ў Мінску.

***— Жыццё на іншым кантыненце аказалася складаным?***

— Калі табе 23 гады, увесь свет у тваіх ног. Для мяне не было нічога складанага ў тым, каб нават праязджаць у адзін бок 130 кіламетраў дзеля аднаго ўрока. Здымныя кватэры, пакоі... Цяпер не ведаю, ці адважылася б я на такую авантуру. Гэты вопыт даў вялікі штуршок у маім жыцці, я перагледзела, як трэба працаваць трэнеру, вывучыла англійскую мову. Хоць, вядома, вельмі сумавала літаральна пасля таго, як прайшло першае захапленне ад новай краіны. Усе грошы, якія ўдавалася зарабляць, я адкладвала на білет, каб паляцець дадому, ні пра якое збіранне і гаворкі ісці не магло. Лётала часта ў Мінск да таго, пакуль канчаткова не вырашыла вярнуцца дадому пасля нараджэння дачкі.

***— Каханне на нейкі час занесла вас у Тайланд...***

— Гэта дакладна не мая краіна, туды вельмі выдатна проста прыехаць адпачыць. У Тайландзе я жыла каля года, на той момант там знаходзіўся тата маёй дачкі. З ім у нас атрымалася такая жыццёвая гісторыя: не заўсёды два лідары могуць ужыцца разам. У Тайландзе быў перыяд, калі я цалкам адышла ад шахмат, акунулася ў ціхае сямейнае жыццё і ад гэтага ўсяго пачала гінуць, усё ж мне патрэбна жыццёвая актыўнасць. Для кагосьці шчасце — быць жонкай і мамай, для мяне, здаецца, — тое, што цяпер я прыношу нейкую карысць, і гэта выдатна. Хоць самае галоўнае, вядома, гэта тое, што я мама. Можа быць, не ў тым аб'ёме, у якім хацелася б, але я спадзяюся, мне ўдасца гэта нагнаць, калі я стану бабуляй, напрыклад.

***— Вяртанне ў Беларусь было звязана з прафесійнай або сямейнай сітуацыяй?***

— Па-першае, я вельмі сумавала, нездарма ж гаворыцца: дзе нарадзіўся, там і прыгадзіўся. Толькі ў Беларусі я адчуваю сябе па-сапраўднаму шчаслівай. Я вярталася ў Мінск з месячным дзіцем на руках, ні пра якую працу тады і не думала. Праз нейкі час з сяброўкай паспрабавалі адкрыць інтэрнэт-краму, нічога з гэтага не выйшла, я не камерсант. Жыццё само павярнулася такім чынам, што ў мяне з'явілася свая школа шахмат. Знаёмы папрасіў знайсці трэнера для яго трохгадовага сына, мы зрабіць гэтага не змаглі, таму што дзяцей раней набіралі з больш позняга ўзросту. Тады ён прапанаваў пазаймацца з дзіцем мне, але на той момант я ўжо адышла ад трэнерскай працы. На гэта ён сказаў: «Тады давай адкрыем школу, што для гэтага трэба?» Я сказала, што для пачатку добра было б адкрыць сайт, і забылася пра гэта. Праз нейкі час ён мне патэлефанаваў і паведаміў, што сайт гатовы.

Спачатку мы здымалі маленькі клас у Палацы шахмат, з гэтага ўсё пачалося. А цяпер мы ўжо разрасліся да таго, што маем цудоўнае памяшканне ў САК «Алімпійскі», дзе ўсё прасякнута духам спорту.

***— Як тады зноў адчулі сябе ў ролі трэнера?***

— Вельмі добра. Мне хацелася злучыць аўстралійскі вопыт з беларускім, таму што гэта зусім розныя падыходы выкладання. Мне здаецца, поспех нашай школы быў звязаны менавіта з гэтым. Мы былі першай школай, якая пачала навучанне дзетак менавіта з трох гадоў. Мы ўсе вельмі радуемся вынікам і спадзяёмся, што ў нас будуць выхаванцы, якія дойдуць да сусветных вяршынь, але самае галоўнае — канцэпцыя нашай школы заключаецца ў тым, каб як мага больш дзяцей проста палюбілі шахматы.

***— За паўтара года вы зрабілі шмат, а што ў найбліжэйшых планах?***

— Цяпер самае галоўнае не проста добра правесці алімпіяду, а вельмі добра, а лепей за ўсё правесці яе лепш, чым усе астатнія калі-небудзь.



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

## НАШЫ КЛУБЫ НАБІРАЮЦЬ ВАЖНЫЯ АЧКІ

**У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязды» расказваем пра самыя актуальныя падзеі выхадных.**

**1.** ***Віталь Міхайлаў перамог у мас-старце на этапе Кубка свету па канькабежным спорце ў японскім Тамакамаі.*** Шаснаццаць кругоў на адкрытым катку беларус пераадолеў за 8 хвілін 06,54 секунды і атрымаў 120 ачкоў.

Іншы прадстаўнік Беларусі Аляксей Кірпічнікаў заняў у мас-старце шостае месца. У жаночай гонцы з масавага старту беларуска Марына Зуева стала 21-й.

Адзначым, для Віталя Міхайлава гэта першае «золата» Кубка свету. У агульным заліку турніру з 186 ачкамі ён займае дзясятую пазіцыю.

**2.** ***Беларускі кікбаксёр Чынгіз Алазаў чарговы раз абараніў званне чэмпіёна свету, па версіі Nuit Des Champions (NDC).*** Паядынак у вагавой катэгорыі 70 кг праходзіў у Марсэлі, аднагалосным рашэннем суддзяў спартсмен з Беларусі атрымаў упэўненую перамогу над бельгійскім атлетам Махамедам Хэндафам.

**3.** ***Брэсцкі гандбольны клуб імя Мяшкова перарваў серыю з шасці паражэнняў запар у Лізе чэмпіёнаў.*** У дамашнім паядынку супраць македонскага «Вардара» падапечныя Манола Кадэнаса звялі сустрэчу да выніку — 31:31. Зараз брэстаўчане маюць у сваім активе 5 ачкоў і займаюць 6-е месца ў турнірнай табліцы групы А.

Наступны паядынак групавога этапу БГК правядзе 2 снежня ў гасцях у лідара групы «Барселоны», якая напярэдадні перамагла ў Кельцэ «Віве» — 42:36.

**4.** ***Гандбалісткі зборнай Беларусі перамажна завяршылі выступленне ў кваліфікацыйным турніры чэмпіянату свету 2019 года.*** У матчы 3-га тура адборачнай групы тры беларускі ўпэўнена перайгралі каманду Італіі з лікам 35:26 і, занаўшы першае месца, выйшлі ў плэй-оф сусветнага першынства. Нагадаем, да гэтага падапечныя Томажа Чатэра перамаглі зборныя Партугаліі — 31:23 і Грэцыі 28:18.

Матчы за пуцёўкі ў фінальную стадыю сусветнага першынства адбудуцца ў чэрвені 2019 года. Вырашальны этап жаночага чэмпіянату планеты па гандболе пройдзе ў канцы 2019 года ў Японіі.

**5.** ***У трэцім туры чэмпіянату Расіі па валейболе «Мінчанка» абыграла «Ленінградку» ў дамашнім матчы з лікам 3:0.*** Такім чынам, у активе беларускай каманды чатыры ачкі. Наступны матч у чэмпіянаце Расіі па валейболе сярод жаночых камандаў «Мінчанка» згуляе на выездзе 1 снежня супраць екацярынбургскай «Уралачкі».

**Матэрыялы падрыхтавала Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

Фаліянты

# ГОДНАЯ ГІСТОРЫЯ НА КАРТАХ

**«Вялікі гістарычны атлас» — унікальны збор картаў, якія складаліся разам цягам дзесяці гадоў і ўрэшце трапілі пад вокладку чатырохтоміка. У аснову перыядызацыі пакладзены лёсавызначальныя этапы развіцця нашага народа. Праца выканана Дзяржаўным камітэтам па маёмасці, у прыватнасці, філіялам «Белкартаграфія», пры ўдзеле спецыялістаў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, Беларускага навукова-даследчага цэнтра электроннай дакументацыі.**



Фота Андрэя САЗОНАВА.

— Гэта выданне — цудоўны прыклад сумеснай працы вучоных, картографаў, архівістаў, — кажа **старшыня Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Андрэй ГАЕЎ,** — гэта вынік дзесяцігадовай працы. Атлас поўна адлюстроўвае гісторыю краіны ад старажытнасці да нашых дзён, паказвае месца беларусаў сярод еўрапейскіх народаў. Надзвычай трапна сабраны пад адной вокладкай розныя карты — некаторыя з іх былі надрукаваны ўпершыню... Калі перагортваеш старонкі атласа, паглыбляешся ў той загадкавы свет, які быў складзены з мноства падзей, нечаканых адкрыццяў і мільёнаў найцікавейшых, але часам вельмі трагічных лёсаў нашых продкаў.

Першы том пабачыў свет у 2009 годзе. У ім асвятляецца час ад з'яўлення першабытнага чалавека на нашых землях і да сярэдзіны XVI стагоддзя, калі ў 1569 годзе нашы землі былі ўключаны ў склад Рэчы Паспалітай.

Матэрыялы гэтага тома адлюстроўваюць таксама гісторыю ўсёй усходнееўрапейскай прасторы. У яго ўключаны карты асобных рэгіёнаў, планы гарадоў, схемы ваенных сутыкненняў. Змешчана там і буйнамаштабная Генеральная карта, рэпрадукцыі старадаўніх картаў.

Другі том быў выпушчаны ў 2012 годзе і цалкам прысвечаны таму часу, калі нашы землі ўваходзілі ў склад Рэчы Паспалітай — аж да перыяду яе знікнення з карты свету ў канцы XVIII стагоддзя.

У кнізе адлюстраваны ваенна-палітычныя падзеі, эканамічныя, рэлігійныя і культурныя працэсы, якія адбываліся на нашых землях. У некаторых выпадках яны паказаны ў кантэксце ўсяго ўсходнееўрапейскага рэгіёна. Прадстаўлены таксама планы гарадоў і схемы самых важных бітваў. Дапаўняюць выданне рэпрадукцыі старадаўніх картаў, створаных у Рэчы Паспалітай і краінах Заходняй Еўропы, на якіх выявлена тэрыторыя Беларусі.

Вялікая колькасць населеных пунктаў, што згадваліся ў крыніцах, былі паказаны ўпершыню. Акрамя іх, на Генеральнай карце абазначаны і межы маёнткаў, а ў паказальніку — іх прыналежнасць канкрэтным уладальнікам напярэдадні першага падзелу Рэчы Паспалітай у 1772 годзе. Таксама прыводзіцца падрабязная інфармацыя пра размяшчэнне касцёлаў, цэркваў, манастыроў з указаннем іх колькасці ў пэўным населеным пункце.

Трэці том «Вялікага гістарычнага атласа Беларусі» быў выдадзены ў 2015 годзе і прысвечаны таму перыяду, калі беларускія землі ўваходзілі ў склад Расійскай Імперыі. Тэматычна раздзелы атласа даюць уяўленне пра розныя бакі гэтага перыяду. Шэраг картаў прысвечаны адміністрацыйна-тэрытарыяльным перабудовам на гэтых землях, сацыяльна-эканамічнаму развіццю і духоўна-культурнаму жыццю грамадства. Асаблівая ўвага ўдзяляецца грамадска-палітычнаму жыццю і нацыянальнаму руху, якія стварылі ўмовы для ўзнікнення ў далейшым беларускай дзяржавы. Падборка рэпрадукцый картаў і планаў, складзеных у той час у асноўным расійскімі картографамі, адлюстроўвае працэс картаграфічнага засваення беларускіх земляў новай уладай. На этнаграфічных картах таго часу ўпершыню была абмалявана тэрыторыя беларускага этнасу.

У якасці дадатку да Генеральнай карты прыведзены агульны спіс населеных пунктаў беларускіх губерняў пачатку XX стагоддзя, створаных па гістарычных крыніцах з прывязкай да гэтай карты і сучаснага адміністрацыйнага падзелу Беларусі.

Чацвёрты том, выдадзены ў 2018 годзе, адлюстроўвае перыяд ад Лютаўскай рэвалюцыі 1917 года да нашых дзён. У ім паказаны ваенныя і рэвалюцыйныя падзеі, грамадска-палітычныя, адміністрацыйныя змены, што адбываліся на тэрыторыі Беларусі, сацыяльна-эканамічныя, рэлігійныя і культурныя працэсы, а таксама іншыя аспекты станаўлення Беларусі як актыўнага дзеяча міжнародных адносін.

— Я ўпэўнены, што чатыры тамы «Вялікага гістарычнага атласа Беларусі» з задавальненнем захочуць атрымаць у свае фонды найбуйнейшыя бібліятэкі свету, — мяркуе **дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Раман МАТУЛЬСКІ.** — Таму што ў іх адлюстраваны не толькі Беларусь і яе гісторыя, але і гісторыя Еўропы, развіцця дзяржаўнасці, розных палітычных саюзаў. Гэта гісторыя таго, як наша краіна жыла стагоддзямі, прычым жыла годна!.. Як член шматлікіх камісій, якія ацэньваюць кнігі — з паліграфічнага пункту гледжання, адносна зместу, — я ўпэўнены, што выданне чакае лёс пераможцы і яно не раз будзе сярод лаўрэатаў розных конкурсаў. Бо аналагаў такіх зборнікаў няма ў свеце. Варта адзначыць і тое, што гэта не падарункавае выданне — хоць будзе глядзецца выдатна на любой паліцы. Але галоўнае — гэта змест. Я ўпэўнены, што выданне будзе чытацца і будзе зачытанае да дзірак.

Запрашальнік

# ЧАМАДАНЧЫК СА ШКЛЯНЫМІ ПЛАСЦІНКАМІ

**Знайсці падборку старых фotaнегатываў... Пазнаць на іх сваю мясцовасць... Заняцца пошукам аўтара, распытаць мясцовых жыхароў і нарэшце адкрыць важнае імя... 7 снежня ў Нацыянальным гістарычным музеі ўрачыста адкрыецца выстаўка «Сава Сіўко (1888—1978). Фатограф Любчанскага краю. Да 130-годдзя з дня нараджэння».**

Экспазіцыя ўпершыню прадставіць творчую спадчыну вясковага фатографа Савы Уладзіміравіча Сіўко, які нарадзіўся ў вёсцы Сенна каля мястэчка Любча і працаваў у гэтым рэгіёне больш за 30 гадоў. Прадстаўленыя матэрыялы з'яўляюцца ўнікальнай скарбніцай візуальнай інфармацыі пра паўсядзённае жыццё беларусаў «заходнікаў» у складаную эпоху перамен — 20—50-я гады XX стагоддзя.

Паўтара года таму ў фонды музея трапілі два невялікія чамаданчыкі са старымі шклянымі пласцінкамі міжваеннага часу. Але ні аўтар, ні дакладныя месцы на фотаздымках на той час не былі вядомыя. Уражваў сам факт існавання такой шматлікай калекцыі. Захавалася 582 (а сёння іх колькасць склала 1027!) крохкія шкляныя негатывы. І гэта пасля ўсіх катаклізмаў XX стагоддзя! Музейшчыкі пачалі працу па пошуку аўтара «архіва стагоддзя».

Выстаўка раскажа пра гісторыю гэтага найцікавейшага пошуку, а таксама прадставіць новыя знаходкі, што паўсталі падчас музейных экспедыцый дзякуючы землякам фатографа — жыхарам мястэчка Любча, вёсак Купіск, Сенна, адзін з якіх — 98-гадовы жыхар вёскі Нянькава Іван Ігнацьевіч Камар — успомніў імя аўтара фатаграфій Савы Уладзіміравіча Сіўко.

У экспазіцыі будуць прадстаўлены 170 фатаграфій Савы Сіўко. Большасць з іх — гэта сапраўдныя жэлаціна-срэбраныя фотаадбіткі, надрукаваныя з арыгінальных фотанегатываў метадам кантактнага фотадруку сучасным фотамастаком Альбертам Цэхановічам. Усю калекцыю цалкам можна будзе пабачыць на адным з маніторaў, усталяваных у выставачнай зале.

Шмат кранальных гісторый аб тагачасным жыцці пачулі навуковыя супрацоўнікі музея падчас вандровак па Любчанскім краі. Магчымасць выслухаць гэтыя асабістыя гісторыі «з першых вуснаў» атрымаюць усе наведвальнікі выстаўкі.

Сярод знойдзеных на паддашы рэчаў фатографа была адна ўнікальная — маляваны фатаграфічны экран, на фоне якога ў 1930-я гады рабіў партрэтныя фотаздымкі аўтар. Адрэстаўраваны на сродкі гранта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь мастаком-рэстаўратарам музея Юліяй Дранец. Ён будзе адным з ключавых экспанатаў выстаўкі.

Па матэрыялах музейных экспедыцый адмыслова для гэтага выставачнага праекта была створана кароткаметражная відэаінсталяцыя (рэжысёр, аўтар сцэнарыя і аператар Андрэй Васкрасенскі). Стужка будзе дэманстравацца ў прасторы выставачнай залы ў рэжыме нон-стоп.

Ігуменскі тракт
№ 22 (220)

Сваімі словамі

# Хто стане мецэнатам для кніг?..



**Ці просты ён, шлях кнігі да чытача? А таксама шлях аўтара да яго ўласнага выдання? Гэта дарога крыху даўжэйшая, чым можа падавацца на першы погляд.**

Нагодай для сённяшняй публікацыі стала навіна, якую пабачыла ў сацыяльных сетках адразу трох (!) сяброў-пісьменнікаў з Украіны. І не тое каб вельмі шмат з якімі аўтарамі з Украіны я сябравала — таму такі збег навін (апярэджу аповед, добрых навін) мяне ўразіў. Дык вось, кнігі гэтых пісьменнікаў і паэтаў, як і многіх іншых іх суайчыннікаў, былі ўхваленыя на закупку для цэнтралізаванай украінскай бібліятэчнай сістэмы. Хтосьці з гэтых аўтараў даволі вядомы ў межах сваёй краіны. Іншыя ж — зусім маладыя творцы, якія паспелі выдаць толькі першую ўласную кнігу. І вось іх ужо рэкамендавалі для бібліятэчных фондаў! Выбарам твораў займалася спецыяльная экспертная рада, якая абрала 741 кнігу, і выдзеліла для гэтай мэты 120 мільёнаў украінскіх грыўняў (9 мільёнаў 107 тысяч беларускіх рублёў).

Думаю, гэта надзвычай добры крок. Па-першае, безумоўна ж, кожнаму аўтару надзвычай прыемная такая ўвага. Гэта і вельмі добры сродак папулярызацыі: у тых мясцінах, дзе раней было мала шанцаў на тое, што пра аўтара хтосьці даведаецца, цяпер у бібліятэках могуць з'явіцца яго кнігі. Па-другое, і ў нас сёння шмат кажуць пра не самы просты час жыцця бібліятэк: іх наведваюць усё радзей і ўсё меншая колькасць чытачоў. Можа, прычына тут не толькі ў развіцці тэхналогій, але і ў тым, што бібліятэкі не надта паспяваюць не тое што за часам, але хоць бы за новымі аўтарамі і кнігамі?.. Безумоўна, такі крок нашых суседзяў будзе карысны для падтрымання іх бібліятэчнай сістэмы. Мяркую, многія падумаюць пра тое, каб зноў завітаць у бібліятэкі, калі даведаюцца, што туды паступілі кнігі самых сучасных, самых актуальных аўтараў.



Што ж маем мы? У адносінах «аўтар — бібліятэка» існуе даволі няпростая схема. Калі пісьменнік ці паэт хоча, каб яго твор пабачыў свет, адзін са спосабаў — самому атрымаць заяўкі ад бібліятэк, якія гатовы былі б набыць яго кнігі. Гэта значыць, што аўтар, цалкам магчыма яшчэ зусім невядомы, павінен завітаць да добрага тузіна дырэктараў бібліятэк і выкарыстаць усю сваю харызму і абаянне, спрабуючы давесці, што ім сапраўды трэба даць згоду на набыццё яго будучай кнігі. Натуральна, якая гэта кніга, бібліятэкар і дырэктар пакуль не ўяўляюць — бо размова вядзецца пра будучыню, а на дадзеным этапе твор яшчэ не выйшаў...

«Каб выдаць кнігу пэўнага аўтара, мы павінны бачыць перспектыву яе рэалізацыі, — кажа **дырэктар выдавецтва «Мастацкая літаратура» Алесь БАДАК.** — Гэта могуць быць заказы бібліятэк, сеткі «Белкніга», прыватных кнігарняў. У любым разе кніга павінна быць запатрабаванай. Аўтар можа даць нам адрасы бібліятэк, гатовых атрымаць яго выданне, а з бібліятэкарамі мы звяжамся самі».

Мяркую, што далёка не ў кожнага аўтара знойдуцца маральныя сілы, каб выправіцца ў такі паход па бібліятэках. А ў іншых выпадках даволі мала шанцаў, што яго выданні з'явяцца на паліцах публічных чытальняў. Такое вось замкнёнае кола.

Я вельмі радуюся за сваіх украінскіх сяброў, калі чую добрыя навіны пра іх літаратурную сферу. Рэгулярна хтосьці перамагае ў пэўных конкурсах — і атрымлівае магчымасць выдаць першую (ці не першую) уласную кнігу. Вельмі важна і тое, што кнігі ва Украіне вызвалены ад падатку на дабаўленую вартасць. Апошняе істотна спрашчае жыццё іх выдаўцам і агулам умацоўвае кніжны рынак, дадае магчымасцяў палепшыць якасць выпушчаных твораў.

Калі вярнуцца да Беларусі, то згадваюцца багатыя кніжныя зборы Радзівілаў, Сапегаў, Паскевічаў, Храптовічаў, Агінскіх і многіх іншых выдатных родаў, якія існавалі на нашых землях раней. Бібліятэкі займалі свае пачэсныя, даволі прасторныя месцы ў палацах. У пазнейшыя часы ліхалеццяў кнігазборы вывозіліся ворагамі за межы краіны як багатыя, жаданыя трафеі... Будзем жа памятаць і адначляць слаўную традыцыю бібліятэк.

Матэрыялы падрыхтавала Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА по продаже права заключения договора аренды земельного участка

**Организатор аукциона:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 24-63-14

| Предмет аукциона, кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка, срок аренды, размер начальной цены и задатка |
|---|
| Лот № 1. Право заключения договора аренды сроком на 99 лет земельного участка с кадастровым № 221882201901000050, расположенного по адресу: Витебская обл., Городокский р-н, Вайханский с/с, д. Большое Лосвидо, площадью 0,5267 га для строительства объекта «Строительство дома охотника и рыболова с благоустройством прилегающей территории в д. Большое Лосвидо Вайхановского сельсовета Городокского района Витебской области» (назначение: 0 19 00 – земельный участок рекреационного назначения). Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона реки, водоема (оз. Лосвидо, оз. № 26, ручей), прибрежная полоса реки, водоема (оз. Лосвидо), охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 В. **Нач. цена:** 1 027,06 бел. руб. **Задаток:** 102,71 бел. руб. |
| **Дата, время и место проведения аукциона:** 28.12.2018 в 11.00, Витебская обл., г. Городок, ул. Пролетарская, 2, в Городокском райисполкоме. Срок внесения задатка и подачи документов: с 27.11.2018 с 8.30 по 27.12.2018 до 17.30. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с BY95AKBB36003160071060000000 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 300594330, код платежа – 04002, получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (районный бюджет) |

Аукцион проводится в порядке, установленном Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462. **Условия аукциона: победитель аукциона, единственный участник несостоявшегося аукциона, обязан:** в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола аукциона либо признания аукциона несостоявшимся: внести плату за право заключения договора аренды зем. участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, формированием и гос. регистрацией в отношении зем. участка; не позднее 2 рабочих дней после выполнения указанных выше действий заключить договор аренды земельного участка с Городокским райисполкомом; в течение 2 месяцев со дня подписания договора аренды, обратиться за гос. регистрацией права, ограничений (обременений) на зем. участок; в течение 6 месяцев со дня государственной регистрации возникновения права на земельный участок приступить к занятию данного участка в соответствии с целью и условиями его предоставления, для чего: разработать, согласовать и утвердить в установленном порядке проектную документацию на строительство объекта и подключение его к инженерным коммуникациям, получить в отделе архитектуры и строительства Городокского райисполкома разрешение на строительство объекта, перед началом строительства снять из-под пятен застройки плодородный слой почвы и использовать его на строительство газона равновеликой площадью на землях общего пользования д. Большое Лосвидо в месте (местах) по согласованию с Вайхановским сельисполкомом; обеспечить соблюдение обязанностей землепользователей (арендаторов) земельных участков, предусмотренных ст. 70 и 89 Кодекса Республики Беларусь о земле и договором аренды; не позднее чем за три месяца до истечения срока аренды письменно уведомить арендодателя о намерении заключить договор аренды на новый срок или по истечении срока действия договора аренды возвратить земельный участок арендодателю в состоянии, пригодном для использования его в качестве земель общего пользования. Для участия в аукционе приглашаются граждане, индивидуальные предприниматели, юр. лица, консолидированные участники (двое и более граждан, индивидуальных предпринимателей, юр. лиц). Для участия в аукционе граждане, индивидуальные предприниматели, консолидированные участники и юр. лица (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) в установленный срок подают заявление на участие в аукционе, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, с отметкой банка, заключают соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования; индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о гос. регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность; представителем юр. лица РБ – доверенность, выданная юр. лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих гос. регистрацию юр. лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юр. лица; представителем иностранного юр. лица – легализованные копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык, легализованные доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о фин. состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем иностранного гражданина – легализованная доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; консолидированными участниками представляются оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе. При подаче документов предъявляется документ, удостоверяющий личность. Аукцион состоится при наличии не менее 2 участников. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра на местности зем. участка. Контактные тел.: (0212) 24-63-14, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by.

**Антикризисный управляющий индивидуальный предприниматель Шило Алексей Сергеевич** (г. Минск, ул. Б. Берута, 3Б, оф. 517, тел. 8029 3360872) извещает о проведении вторых повторных торгов в форме аукциона по продаже имущества общества с ограниченной ответственностью «Сфера-СК», расположенного по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, 191: лот № 1: мобильный пневмоангар МПА-9-4-5-200, начальная цена – 7 699,20 бел. руб. без НДС; лот № 2: контейнер сетчатый 80х12, начальная цена – 1177,60 бел. руб. без НДС; лот № 3: опалубка PERI, начальная цена – 29 972,80 бел. руб. без НДС. Торги состоятся 14 декабря 2018 г. по адресу: г. Минск, ул. Б. Берута, 3Б, оф. 517. Заявки принимаются с 28 ноября 2018 г. с 09.00 до 13 декабря 2018 г. до 17.00. Продавец – общество с ограниченной ответственностью «Сфера-СК». Сумма задатка за участие в торгах – 5 % от начальной цены предмета торгов. Местонахождение предмета торгов: г. Минск, пр-т Независимости, 191. Торги проводятся в форме аукциона, открытого по составу участников и по форме подачи предложений о цене. Шаг торгов – 5 % от начальной цены предмета торгов. Для участия в торгах лицо, заявившее о своем участии в торгах, до даты торгов вносит задаток в счет обеспечения оплаты приобретаемого на торгах имущества в размере 5 процентов от начальной цены имущества должника, выставляемого на торги. Участник торгов, желающий участвовать в торгах по нескольким предметам торгов, вносит задаток в размере, установленном для предмета торгов с наибольшей начальной ценой. До подачи заявки Претенденту необходимо перечислить задаток в безналичном порядке по следующим платежным реквизитам: ООО «Сфера-СК», УНП 690280666, р/с BY86PJCB30120110991000000933 ОАО «Приорбанк», код банка PJCBBY2X. Заявления на участие в аукционе с приложением платежного поручения, подтверждающего внесение задатка, а также: для юридических лиц – заверенной копии свидетельства о гос. регистрации, устава, документы, подтверждающие полномочия представителя; для индивидуального предпринимателя – заверенной копии свидетельства о гос. регистрации, копия паспорта; для физ. лица – копии паспорта, принимаются по адресу: г. Минск, ул. Б. Берута, 3Б, оф. 517. Срок возможного отказа от проведения торгов – 12.12.2018. Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену покупки. После окончания торгов в день проведения торгов с победителем подписывается протокол. Договор с победителем торгов заключается в течение 15 дней с даты проведения торгов и утверждения протокола о результатах торгов. Победитель торгов обязан оплатить стоимость покупки в течение 10 дней после подписания протокола. Условия отгрузки – 100 % предоплата. Возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. В случае признания торгов несостоявшимися в связи с подачей заявления на участие в них только одним участником возможна продажа предмета торгов этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Получить полную информацию о порядке и условиях проведения торгов, о предмете торгов можно в рабочие дни с 09.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Б. Берута, 3Б, оф. 517, тел.: (017) 2150240, (029) 3360872. Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочие дни с 9.00 до 18.00 с предварительным согласованием с организатором торгов.

# Извещение о проведении первых и повторных аукционов по продаже земельных участков в частную собственность

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел. (0212) 24-63-14

| Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка |
|---|
| Лот № 1. Земельный участок с кадастровым № 225880708301000074, площадью 0,1516 га по адресу: Витебская обл., Шумилинский р-н, Добейский с/с, д. Непороты, 55А для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона рек и водоемов (оз. Разван); придорожная полоса (контролируемая зона) автомобильных дорог. **Нач. цена**: 836,83 бел. руб. **Задаток:** 83,68 бел. руб. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с BY46AKBB36003310150010000000 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 300594330, код платежа – 04901, получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (Добейский с/с) |
| **Дата, время и место проведения аукциона:** 28.12.2018 в 11.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатка и приема документов:** с 27.11.2018 с 8.30 по 27.12.2018 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» в рабочие дни с 8.30 до 17.30 |
| Лот № 1. Земельный участок с кадастровым № 221283703101000121, площадью 0,1493 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Куринский с/с, д. Задвинье, ул. Надречная, участок № 2 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона рек и водоемов (р. Западная Двина), охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 В. **Нач. цена:** 2 000,00 бел. руб. **Задаток:** 200,00 бел. руб. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с BY22AKBB36003140700920000000 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 300594330, код платежа – 04901, получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (Куринский с/с) |
| Лот № 2. Земельный участок с кадастровым № 221285904101000239, площадью 0,1195 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Мазоловский с/с, д. Дреколье, ул. Центральная, У-2 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона рек и водоемов (оз. Боровское). **Нач. цена:** 2 000,00 бел.руб. **Задаток:** 200,00 бел. руб. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с BY89AKBB36003140901730000000 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 300594330, код платежа – 04901, получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (Мазоловский с/с) |
| Лот № 3. Земельный участок с кадастровым № 221281205101000142, площадью 0,1402 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Вороновский с/с, д. Поляи, ул. Луговая, У-2 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: мелиорируемые (мелиорированные) земли. **Нач. цена: 7** 000,00 бел. руб. **Задаток:** 700,00 бел. руб. |
| Лот № 4. Земельный участок с кадастровым № 221281205101000141, площадью 0,1485 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Вороновский с/с, д. Поляи, ул. Луговая, У-3 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: мелиорируемые (мелиорированные) земли. **Нач. цена: 7** 000,00 бел. руб. **Задаток:** 700,00 бел. руб. |
| **Реквизиты для внесения задатка:** р/с BY89AKBB36003140200420000000 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 300594330, код платежа – 04901, получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (Вороновский с/с). Условия аукциона: возмещение убытков, причиненных нарушением мелиоративных сооружений в сумме 667,35 руб. (лот № 3), 706,86 руб. (лот № 4) |
| **Дата, время и место проведения аукциона:** 28.12.2018 в 15.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатка и приема документов:** с 27.11.2018 с 8.30 по 27.12.2018 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» в рабочие дни с 8.30 до 17.30 |

| Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка |
|---|
| Лот № 1. Земельный участок с кадастровым № 221288500601000034, площадью 0,1387 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Туловский с/с, д. Асетки, ул. 2-я Асетковская для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения отсутствуют. **Нач. цена**: 1 571,77 руб. **Задаток:** 157,18 руб. |
| Лот № 2. Земельный участок с кадастровым № 221288502601000075, площадью 0,1499 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Туловский с/с, д. Пуща, ул. 1-я Пущанская для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения на зем. участке отсутствуют. Нач. цена: 2285,25 бел. руб. Размер задатка: 228,53 бел. руб. |
| **Реквизиты для внесения задатка:** р/с BY36AKBB36003141301470000000 ОАО «АСБ Беларусбанк» БИК AKBBBY2X, УНП 300594330, код платежа – 04901, получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (Туловский с/с) |
| Лот № 3. Земельный участок с кадастровым № 221282904601000221, площадью 0,1500 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Зароновский с/с, аг. Зароново, пер. Южный 1-й, участок № 1 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона рек и водоемов (оз. Княжное), придорожные полосы (контролируемые зоны) автомобильных дорог. **Нач. цена:** 2 000,00 бел. руб. **Задаток**: 200,00 бел. руб. |
| Лот № 4. Земельный участок с кадастровым № 221282904601000220, площадью 0,1500 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Зароновский с/с, аг. Зароново, пер. Южный 1-й, участок № 2 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона рек и водоемов (оз. Княжное), придорожные полосы (контролируемые зоны) автомобильных дорог. **Нач. цена:** 2 000,00 бел. руб. **Задаток**: 200,00 бел. руб. |
| Лот № 5. Земельный участок с кадастровым № 221282913101000168, площадью 0,1136 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Зароновский с/с, д. Суйково, ул. Коммунистическая, 33А для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона рек и водоемов (оз. Искровское). **Нач. цена:** 7 358,13 бел. руб. **Задаток:** 735,81 руб. |
| Лот № 6. Земельный участок с кадастровым № 221282904601000223, площадью 0,1496 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Зароновский с/с, аг. Зароново, ул. 1-я Садовая, 5 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: охранные зоны электрических сетей напряжением до 1000 В, охранная зона линий связи и радиофикации, водоохранная зона рек и водооемов (оз. Зароновское). **Нач. цена**: 1 292,32 бел. руб. **Задаток**: 129,23 бел. руб. |
| **Реквизиты для внесения задатка:** р/с BY53AKBB36003140600860000000 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 300594330, код платежа – 04901, получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (Зароновский с/с) |
| Лот № 7. Земельный участок с кадастровым № 221284810101000094, площадью 0,1336 га, по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Летчанский с/с, д. Новоселки, участок 4 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона рек и водоемов (р. Западная Двина, оз. Белое). **Нач. цена:** 4 000 бел. руб. **Задаток:** 400 бел. руб. |
| Лот № 8. Земельный участок с кадастровым № 221284810101000096, площадью 0,1439 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Летчанский с/с, д. Новоселки, участок 7 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона рек и водоемов (р. Западная Двина, оз. Белое). **Нач. цена:** 4 000,00 бел. руб. **Задаток:** 400,00 бел. руб. |
| **Реквизиты для внесения задатка:** р/с BY20AKBB36003140801090000000 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 300594330, код платежа – 04901, получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (Летчанский с/с) |
| Лот № 9. Земельный участок с кадастровым № 221288109601000642, площадью 0,0951 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Октябрьский с/с, д. Сокольники, ул. Северная, 1А для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: отсутствуют. **Нач. цена**: 8 000,00 бел. руб. **Задаток**: 800,00 бел. руб. |
| Лот № 10. Земельный участок с кадастровым № 221288109601000653, площадью 0,1500 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Октябрьский с/с, д. Сокольники, ул. Северная, 13А для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: охранные зоны электрических сетей напряжением до 1000 В. **Нач. цена**: 9800,00 бел. руб. **Задаток**: 980,00 бел. руб. |
